Студэнты войска не баяцца!

СТАР. 3

Праўда пра целаахоўніка Сталіна

СТАР. 5

Цуда-парк у Ашмянах

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

22 ЛІПЕНЯ 2015 г. СЕРАДА № 137 (27995) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЯРНУЦЦА ДА ГАЛОЎНЫХ РОЛЯЎ

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што праблема рэфармавання міжнародных арганізацый даўно наспела

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з дзейным старшынёй АБСЕ, першым намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам замежных спраў Сербіі Івіцам Дачычам, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

«Пагадзіцеся, што роля не толькі АБСЕ, але і іншых міжнародных арганізацый настолькі прыніжаная, што далей ужо няма куды», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. На яго думку, рэфармаванне ААН, АБСЕ і іншых арганізацый «ўжо не проста наспела, а пераспела». У адваротным выпадку гэтыя арганізацыі стануць проста маргінальнымі структурамі, якія ні на што не будуць уплываць.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго стаўленне да АБСЕ дваістае. «З аднаго боку, патрэбна арганізацыя, якая павінна іграць значную ролю менавіта ў забеспячэнні бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе, з другога боку — недастатковая роля», — сказаў беларускі лідар. На яго думку, у гэтым віна самой арганізацыі і перш за ўсё — кіраўнікоў дзяржаў.

«Калі ўжо вайна, то, напэўна, у тэрміновым парадку павінны былі сабрацца кіраўнікі дзяржаў, абмеркаваць гэтую праблему і прыняць нейкія меры, рашэнні. Не атрымалася — хоць бы ў вочы сказаць усё тое, што адзін пра аднаго думаюць. Пакуль гэтага не адбываецца», — адзначыў беларускі лідар. Хоць, па яго словах, «АБСЕ спрабуе і, наколькі гэта, напэўна, магчыма сёння, робіць неабходнае для ўрэгулявання канфлікту на ўсходзе Украіны». Але, лічыць Аляксандр Лукашэнка, з тымі паўнамоцтвамі, якімі АБСЕ сёння валодае, не маючы імпульсу ад кіраўнікоў дзяржаў, наўрад ці арганізацыя ў гэтай сітуацыі можа нешта зрабіць. Таму, паводле яго слоў, з'яўляюцца новыя фарматы: нармандскія, берлінскія, мінскія і іншыя. «Усё гэта магло змясціцца ў адной арганізацыі — АБСЕ, і гэта яе функцыя», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хацеў бы абмеркаваць як пазіцыю Беларусі ў гэтай важнай міжнароднай арганізацыі, так і пытанні двухбаковых адносін Беларусі і Сербіі.

У сваю чаргу, Івіца Дачыч адзначыў: «Тут, у Мінску, дасягаюцца шматлікія дамоўленасці, пагадненні, сустракаюцца трохбаковая кантактная група і яе працоўныя падгрупы. І ў гэтай сувязі Беларусь унесла вялікі ўклад у мірны працэс».

Па словах Івіцы Дачыча, Сербія, з'яўляючыся дзейным старшынёй АБСЕ, імкнецца максімальна прыкласці намаганні, каб палітычны працэс развіваўся, асабліва ў пытаннях, звязаных з Украінай. Пры гэтым не забывае і пра іншыя замарожаныя канфлікты ў Еўропе.

Гаворачы пра двухбаковыя беларуска-сербскія адносіны, Івіца Дачыч сказаў: «Мы падтрымліваем развіццё нашых адносін ва ўсіх сферах: палітычнай, эканамічнай, навукова-культурнай, адукацыі, унутраных спраў, абароны». Ён таксама перадаў кіраўніку беларускай дзяржавы прывітанне ад Прэзідэнта Сербіі Таміслава Нікаліча і прэм'ер-міністра гэтай краіны Аляксандра Вучыча.

ЗНАЙСЦІ АСНОВУ ДЛЯ МІРУ

«Беларусь цалкам падтрымлівае намаганні сербскага старшынства ў АБСЕ, накіраванага на ўмацаванне гэтай арганізацыі, павышэнне бяспекі і стабільнасці ў межах яе адказнасці», — заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей пасля сустрэчы з дзейным старшынёй АБСЕ, першым намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам замежных спраў Сербіі Івіцам Дачычам. Падчас яе кіраўнікі знешнепалітычных установаў дзвюх краін абмеркавалі дзейнасць міжнароднай арганізацыі, пытанні ўзаемадзеяння Беларусі з ёй і ўрэгуляванне крызісу ва Украіне.

«Трэба аддаць належнае, АБСЕ — фактычна адзіная з рэгіянальных арганізацый, якая паспрабавала зрабіць хоць нешта», — сказаў Уладзімір Макей і дадаў, што арганізацыя «актыўна ўдзельнічае ў перамовах трохбаковай кантактнай групы», і галоўная мэта АБСЕ — захоўваць стабільнасць на кантыненце.

Сапраўды, Івіца Дачыч прыехаў у беларускую сталіцу для таго, каб падтрымаць працу групы. «Хачу стымуляваць дасягненне хоць бы невялікіх дамоўленасцяў з тым, каб у канцы быў зроблены вялікі крок у пераводзе гэтага канфлікту з рэчышча ваенных дзеянняў у палітычныя перамовы», — заявіў старшыня АБСЕ.

Па яго словах, Беларусь выконвае значную ролю ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне. У беларускай сталіцы сустракаюцца трохбаковая кантактная група і яе працоўныя падгрупы, прадстаўнікі нармандскага фармату, дасягнуты пэўныя дамоўленасці па крызісу ва Украіне. «Мінск стаў сінонімам мірнага ўрэгулявання крызісу ва Украіне», — падсумаваў ён.

СТАР. 2

Грузіце чарніцы тонамі!

Леанарда КЛІМОВІЧ прымае лясныя дары ў сваіх суседак Тамары БЕРАЖЫНСКАЙ і Алены ЖАГАЛКОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

25-ты нарыхтоўчы сезон праводзіць жыхарка вёскі Магільна Уздзенскага раёна Леанарда Клімовіч — яна прымае ад аднавяскоўцаў і суседзяў грыбы і ягады. Свежыя дары лесу пасля ідуць на перапрацоўку ў Гродна і Ліду, з іх гатуюць сокі, варэнне і джэмы, дзіцячае харчаванне, замарожваюць, адпраўляюць на экспарт. З пачатку гэтага сезона Леанарда Міхайлаўна набыла для дзяржавы амаль паўтары тонны кілаграмаў чарніц і каля паўтоны лісічак.

ЛІЧБА ДНЯ

122,6 тыс. чалавек

сталі ў студзені — чэрвені атрымальнікамі дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) на агульную суму Br260,6 млрд У параўнанні з першым паўгоддзем 2014-га колькасць атрымальнікаў ДАСД павялічылася на 13,3%, а сума прызначанай дапамогі — на 37%. Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога выдзяляецца малазабяспечаным сем'ям (грамадзянам), якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. У рамках сістэмы ДАСД прадастаўляюцца пяць сацыяльных выплат, у тым ліку дзве — для малазабяспечаных: штомесячная сацыяльная дапамога і забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця. Асноўнымі атрымальнікамі штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог традыцыйна з'яўляюцца шматдзетныя і няпоўныя сем'і, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 22.07.2015 г.

Долар ЗША	15200,00	▲
Еўра	16486,00	▼
Рас. руб.	266,51	▼
Укр. грыўня	689,34	▼

■ Абітурыент

Рэкорды прыёмнай кампаніі

Спадзявацца на паступленне на прэстыжныя спецыяльнасці можна, маючы не менш як 350 балаў

Прыёмная кампанія ў беларускіх ВНУ працягваецца. Да 2 жніўня абітурыенты, якім не пашанцуе паступіць на бюджэт, змогуць падаць дакументы на платную форму навучання. Але многія маладыя людзі ўжо сталі студэнтамі — у гэтыя дні ў некаторых ВНУ адбываецца адкрытае залічэнне на першы курс.

У ТРЭНДЗЕ — ПРАГРАМАВАННЕ І ПРАВАЗНАЎСТВА

У тройцы самых запатрабаваных спецыяльнасцяў у БДУІР — «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», «эканоміка электроннага бізнесу» і «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій».

У цэлым па ўніверсітэце сярэдні прахадны бал на дзённую бюджэтную форму навучання склаў 301 бал. Больш як 60% абітурыентаў прыйшлі ў БДУІР з прахаднымі баламі ад 300 і вышэй. Трыццаць абітурыентаў будуць залічаны ва ўніверсітэт без экзаменаў па выніках міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд.

Лепш за ўсіх цэнтралізаванае тэсціраванне здалі будучыя першакурснікі спецыяльнасці «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — спадзявацца на паступленне маглі толькі тыя з іх, хто меў у сваім актыве не менш як 370 балаў. Прахадны бал на спецыяльнасць «эканоміка электроннага бізнесу» — 365, «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 361.

Конкурс у Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь склаў 1,9 чалавека на месца — павялічыўся ў параўнанні з папярэднім годам. У акадэміі канстатуюць, што сёлетняя прыёмная кампанія вылучаецца вельмі сур'ёзным узроўнем падрыхтаванасці абітурыентаў: 67% з тых, хто ўдзельнічае ў агульным конкурсе, атрымалі сумарны бал больш як 300. Сярод прэтэндэнтаў на званне студэнта 79 уладальнікаў залатых і сярэбраных медалёў, пераможцы алімпіяд і ўладальнікі 100-бальных сертыфікатаў.

СТАР. 3

АСЦЯРОЖНА: ДЗЕЦІ!

НЕ ПАКІДАЙЦЕ ІХ АДНЫХ НАВАТ НА ХВІЛІНУ

У мінулую пятніцу трагедыя ледзь не адбылася ў Полацку. На падаконніку пятага паверха стаяў малы і забаўляўся з аконнай створкай. Ратаўнік, выкліканы відавочцамі, па аўталесках забраўся ў кватэру і зняў з акна чатырохгадовага хлопчыка. І заставаўся з ім да таго часу, пакуль на месца падзей не прыбылі супрацоўнік РУУС і маці малога, якая «зусім ненадоўга» пакінула яго аднаго.

Лета — гэта час, калі дзеці большую частку дня не знаходзяцца пад кантролем бацькоў. І ў такім выпадку яны або самі па сабе, або, што здараецца часцей, іх даглядаюць бабулі і дзядулі. У многіх краінах узрост, з якога можна пакідаць дзяцей дома адных, пачынаецца з 12 гадоў. У Беларусі ён заканадаўча не вызначаны. Таму кожны з бацькоў вырашае для сябе сам, калі ж можна пакінуць малога без нагляду. Але не ўсё так проста. Бо закон, на жаль, жыццёвыя абставіны не прапісвае...

БАТАРЭЙКІ, ЗАПАЛКІ, ЛЕКІ І БЫТАВУЮ ХІМІЮ — ПАД ЗАМОК

— Малыя дзеці спазнаюць свет пераважна праз жаданне пакаштаваць на смак незнаёмы прадмет, — гаворыць памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі. — І тут звычайная кватэра ператвараецца ў сапраўднае мінное поле. Вельмі моцную небяспеку ўяўляюць разнастайныя шклоачышчальнікі, бензін, растваральнікі. Іх дарослыя вельмі любяць пераліваць з вялікай тары ў маленькія бутэлькі з яркімі этыкеткамі і пакідаць у зручных для сябе месцах — у тым ліку на кухні або ў ванным пакоі на падлозе. Куды могуць дацягнуцца гарэзлівыя рукі малога. І такое знаёмства дзіцяці з бытавой хіміяй можа скончыцца заменай стрававода імплантатам ці ўвогуле харчаваннем праз трубку. Два гады таму трагедыя прыйшла ў адну гомельскую сям'ю. Бацька ўзяў з сабой чатырохгадовае дзіця ў гараж. Калі дарослы на хвіліну страціў пільнасць, малы глынуў растваральніку з адкрытай бутэлькі.

СТАР. 6

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Тэракт у Турцыі здзейсніла 18-гадовая дзяўчына

Сама меней 30 чалавек загінулі ў панядзелак, 20 ліпеня, у выніку магутнага выбуху на паўднёвым усходзе Турцыі каля мяжы з Сірыяй, раненні атрымалі больш за 100 чалавек. Па звестках прадстаўнікоў паліцыі, тэракт здзейсніла 18-гадовая дзяўчына, якая прывяла ў дзеянне выбуховае прыстасаванне каля ўваходу ў будынак Культурнага цэнтра Амара ў павеце Суруч. Тут пражываюць каля 300 маладых людзей, прадстаўнікоў Федэрацыі маладзёжных таварыстваў сацыялістаў. Выбух адбыўся падчас выступу студэнтаў гэтай арганізацыі, якія планавалі аб'явіць прэсе аб тым, што яны збіраюцца паехаць аднаўляць сірыйскі горад Кабані (Айн-эль-Араб), які на працягу некалькіх месяцаў знаходзіўся пад кантролем экстрэмісцкай групоўкі «Ісламская дзяржава». Пакуль ніхто не ўзяў на сябе адказнасць за тэракт, але праваахоўныя органы лічаць, што за ім стаяць баевікі ІД.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Турцыі Рэджэпу Таіпу Эрдагану, родным і блізкім загінулых і пацярпелых, а таксама ўсяму народу Турцыі.

«Паўднёвы газавы калідор» гатовы на 30%

У рамках рэалізацыі праекта «Паўднёвы газавы калідор» завершана ўжо 30% работ. Пра гэта паведамляе Trend са спасылкай на прэзідэнта кампаніі SOCAR Раўнага Абдулаева. «Ужо падпісаны кантракты са 162 пастаўшчыкамі з 23 краін на агульную суму больш за 10 млрд еўра. Прабурана сем здабыўных свідравін, а будаўніцтва кампрэсарнай станцыі ў Грузіі і вытворчасць труб ідзе поўным ходам», — сказаў Абдулаеў. «Паўднёвы газавы калідор» з'яўляецца адным з прыярытэтных для ЕС праектаў, які прадугледжвае транспартаванне газу з Каспійскага рэгіёна праз Грузію і Турцыю ў еўрапейскія краіны.

У Вільнюсе знялі апошнія савецкія скульптуры

У Вільнюсе завяршыўся дэмантаж скульптурных груп з Зялёнага моста. З моста знялі пяцітонную кампазіцыю «На варце міру», якая паказвае вайскоўцаў. Як паведамляе Delfi са спасылкай на спецыялістаў Вільнюскага тэхнічнага ўніверсітэта імя Гедымінаса, яна была ў самым дрэнным стане. Апошняй дэмантавалі скульптурную групу «Прамысловасць і будаўніцтва». Цяпер на месцы статуй устаноўлены вазоны з кветкамі. Ніякіх пратэстаў з нагоды таго, што адбываецца ў літоўскай сталіцы, заўважана не было. Мэр Вільнюса Рэмігіюс Шымашус нагадаў, што скульптуры здымаюць не для рэстаўрацыі, а дзеля бяспекі. Кіраўнік горада прызнаў, што скульптуры савецкіх рабочых, сялян, студэнтаў і ваенных наўрад ці будуць першымі ў чарзе на аднаўленне.

Мёд — сродак ад большасці хвароб

Мёд — паўнавартасны суперпрадукт. Ён прадухіляе развіццё раку і хваробы сэрца, перадае Zee News. Сакрэт у вялікай канцэнтрацыі флаваноідаў, антыаксідантаў. А яшчэ мёд зніжае рызыку язвы і іншых хвароб страўнікава-кішачнага тракта, у прыватнасці, бактэрыяльнага гастраэнтэрыту. Супрацьгрыбковы і антыбактэрыяльны эфект таксама ёсць у арсенале мёду за кошт наяўнасці энзіму, звязанага з выпрацоўкай перакісу вадароду. Да таго ж мёд спрыяе аднаўленню і рэгенерацыі тканак пры ранах і апёках. А яшчэ мёд паляпшае паказчыкі спартсменаў. Начны кашаль і раздражненне горла, як паказаў эксперымент з удзелам 110 дзяцей, памяншаюць сваю інтэнсіўнасць пасля ўсяго адной дозы грэцкага мёду. Ён аказаўся такім жа эфектыўным, як і дэкстраметарфан.

ПАЗЕРСКІЯ АЛЕНІ

Летась у нашай краіне з'явілася незвычайная ферма, на якой пачалося развядзенне элітных высакародных аленяў. Гэты спецыфічны прытулак для хутканогіх жывёл знаходзіцца ў самым цэнтры азёрнага краю, на памежжы Браслаўскага і Мёрскага раёнаў, недалёка ад вядомага возера Абстэрна. Вальер фермы плошчай 80 гектараў размешчаны на маляўнічых пагорках — калісьці на іх месціліся хутарскія гаспадаркі. На абгароджанай плошчы вольна пасвяцца 150 статных і не надта асцярожных лясных прыгажуноў і прыгажунь. Кожны дзень сюды, да сваіх гадаванцаў, прыязджае захавальнік экзатычнага парку, мясцовы егер Раман Антушэвіч. У акцыянерным адкрытым таварыстве «Абстэрна» ён адказны за ўлік жывёл, раздае корм і сочыць за станам іх здароўя. Папуляцыя беларускіх высакародных аленяў для паляўнічых гаспадарак у хуткім часе значна палепшыцца за кошт гэтай фермы.

СТАР. 6

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

■ Выбары–2015

НАЗІРАННЕ БЕЗ ЦІСКУ

Старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына на канферэнцыі АБСЕ ў Вене заявіла, што інстытут міжнародных наглядальнікаў не павінен выкарыстоўвацца для націску на дзяржавы, пры ўмове выканання абавязацельстваў, накіраваных на захаванне міру і бяспекі.

«Наглядальнікам пры ацэнцы выбараў трэба ўлічваць нацыянальнае заканадаўства», — сказала Лідзія Ярмошына падчас абмеркавання пытанняў аб удасканаленні выбарчага заканадаўства і практыкі падрыхтоўкі і правядзення выбараў на канферэнцыі АБСЕ.

ПОДПІСЫ БЕЗ ПРЫМУСУ

Сёння, 22 ліпеня, — апошні дзень утварэння тэрытарыяльных камісій. Вылучэнне прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных (абласных, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённыя ў гарадах камісіі) было завершана ў нядзелю, 19 ліпеня. Вылучэнне прадстаўнікоў ва ўчастковыя камісіі пачнецца пасля ўтварэння ўчасткаў для галасавання і працягнецца да 23 жніўня 2015 года ўключна.

Заўтра, 23 ліпеня, ініцыятыўныя групы пачынаюць збор подпісаў па вылучэнні кандыдатамі ў Прэзідэнты. Для рэгістрацыі кандыдатам павінна быць сабрана не менш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў. Ставіць у падпісных лістах свае подпісы ў падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння, маюць права грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў і валодаюць выбарчым правам. Выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў Прэзідэнты, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры.

Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Дазволу на пікетаванне для гэтых мэт не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, якія не забаронены мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме. Пры зборы подпісаў у інтэрнатах члены ініцыятыўнай групы павінны захоўваць правілы ўнутранага распарадку.

Падчас збору подпісаў забараняецца прымус і ўзнагароджанне выбаршчыкаў. Выбарчым заканадаўствам таксама забаронены ўдзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў падчас працоўнага часу. Нельга збіраць подпісы і падчас службовых камандзіровак.

Члены ініцыятыўнай групы не маюць права пры зборы подпісаў раздаваць выбаршчыкам друкаваныя матэрыялы. Інфармацыя пра біяграфію асобы, у падтрымку якой збіраюцца подпісы, можа быць прадастаўлена толькі для азнаямлення.

Збор подпісаў будзе доўжыцца да 21 жніўня ўключна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

СІТУАЦЫЮ Ў ГАНДЛІ НЕАБХОДНА ВЫПРАВІЦЬ

Дэпутаты гатовы садзейнічаць росту таваразвароту паміж Беларуссю і Кыргызстанам

У гэтым Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка запэўніў новага пасла Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі Кубанчыбека Амураліева на сустрэчы ў беларускім парламенце.

Кіраўнік ніжняй платы павіншаваў спадара Амураліева з прызначэннем на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі.

— Мы ўпэўнены, што ваш багаты вопыт дыпламатычнай работы дазволіць яшчэ больш пашырыць нашы сяброўскія сувязі, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Беларусь надае вялікую ўвагу супрацоўніцтву з вашай краінай.

Спікер нагадаў, што беларускі парламент адным з першых ратыфікаваў Дагавор аб далучэнні Рэспублікі Кыргызстан да Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Думаю, што далучэнне да гэтага дагавора адкрые новыя перспектывы, у тым ліку і для Кыргызстана, бо каля 40% вашага экспарту прыпадае на краіны Еўразійскага эканамічнага саюза, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Разам з тым беларуска-кыргызскія эканамічна-гандлёвыя адносіны апошнім часам пагаршаюцца. У 2014 годзе таваразварот паміж дзвюма краінамі склаў $95 млн, што на 14% менш, чым у 2013 годзе. За пяць месяцаў гэтага года мы ўвогуле нагандлявалі толькі на $16 млн. У сувязі з гэтым адной з важных задач і для парламентарыяў, і для дыпламатаў Андрэйчанка назваў павелічэнне таваразвароту паміж Беларуссю і Кыргызстанам. «Ён у нас быў $230 млн у 2011 годзе, і думаю, што гэта не мяжа, — заўважыў спікер ніжняй палаты. — Нам трэба не толькі гандляваць, але і больш працаваць па кааперацыі, стварэнні сумесных прадпрыемстваў, зборачных вытворчасяў. Парламентарыі гатовы садзейнічаць гэтым праектам. Нашы дэпутаты ўдзельнічаюць у рабоце міжурадавых камісій. І добра, што сёлета міжурадавая беларуска-кыргызская камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве аднавіла сваю работу пасля сямігадовага перапынку».

Парламенцкія адносіны з Кыргызстанам Уладзімір Андрэйчанка ахарактарызаваў як канструктыўныя. Старшыня ніжняй палаты перадаў просьбу кіраўніку кыргызскага парламента накіраваць прадстаўнікоў у склад назіральных місій парламенцкіх асамблей АДКБ, АБСЕ і Савета Еўропы, якія ўжо запрошаны для назірання за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 11 кастрычніка гэтага года. «Мы жадаем, каб гэта было маштабнае назіранне, з нашага боку ніякіх абмежаванняў ва ўдзеле міжнародных назіральнікаў не будзе», — запэўніў спікер.

Спадар пасол у сваю чаргу падзякаваў беларускім дэпутатам за падтрымку Дагавора аб далучэнні Кыргызстана да Дагавора аб ЕАЭС і пагадзіўся, што саюзніцкія адносіны падштурхнуць гандлёва-эканамічныя сувязі нашых краін. Кубанчыбек Амураліеў таксама выказаў надзею на актывізацыю ўзаемаадносін Беларусі з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва ў сувязі з павышэннем статусу нашай краіны ў гэтай арганізацыі да ўзроўню назіральніка.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

ЗНАЙСЦІ АСНОВУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адказваючы на пытанні журналістаў аб магчымым візіце прэзідэнта Сербіі Таміслава Нікаліча, Івіца Дачыч пацвердзіў гэту інфармацыю, але «з-за шчыльнага графіка кіраўнікоў дзяржаў канкрэтная дата яшчэ не вызначана». У сваю чаргу Уладзімір Макей падкрэсліў, што Сербія з'яўляецца ключавым партнёрам Беларусі на Балканах, і пакуль гэта адзіная краіна ў далёкім замежжы, з якой у Беларусі заключана пагадненне аб зоне свабоднага гандлю. За апошнія 6 гадоў узаемны таваразварот дзяржаў павялічыўся ў 6 разоў, а сёлета — на 35%.

Учора Івіца Дачыч таксама ўзяў удзел у пасяджэнні кантактнай групы па Украіне. Па яго словах, дасягнута дамоўленасць па адводзе танкаў і пэўных відаў узбраення калібрам да 100 мм. Згодна з ёй будзе дакладна вызначана, хто з бакоў і па якой схеме адвядзе ўзбраенне ад лініі судакранання.

Што тычыцца мясцовых выбараў на Данбасе, якія павінны адбыцца гэтай восенню, кантактная група пакуль не прыйшла да згоды. Старшыня АБСЕ таксама дадаў, што застаюцца нявырашанымі гуманітарныя і эканамічныя пытанні. Але незалежна ад гэтага «неабходна паважаць мінскія дамоўленасці» і выконваць іх, падкрэсліў дыпламат.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

НЕ СКАРГАЙ АДЗІНАЙ...

Многія тэлефануюць паўторна, але не з чарговай просьбай, а з падзякай

Як сведчаць водгукі, тэлефонныя «прамыя лініі», што праводзяцца на Міншчыне, запатрабаваны ў жыхароў. З пачатку года падчас іх у райвыканкамы і Жодзінскі гарвыканкам паступіла 2148 званкоў, а ў Мінаблвыканкам — 750. З аднаго боку, гэта сведчанне даверу да абласных улад. Але ж... Многія пытанні можна было б вырашыць непасрэдна на месцах. Ды некаторыя заяўнікі, відаць, лічаць, што чым вышэйшая інстанцыя, тым большая гарантыя, што іх «бяду» рукамі развядуць. На жаль, такую псіхалогію цяжка пераламаць адначасна. Неабавязкова звяртацца ў вобласць, каб адрамантаваць, напрыклад, казырок пад'езда. З гэтай праблемай паспяхова справяцца мясцовыя камунальнікі.

Па даручэнні старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры ў кожным раёне складзены і надрукаваны ў мясцовых сродках масавай інфармацыі спісы чарговасці газіфікацыі вуліц, населеных пунктаў, капітальнага рамонту жылых дамоў, уладкавання дарог, падвядзення камунікацый да прыватных забудоў, добраўпарадкавання двароў і іншае. Такі падыход мае на ўвазе празрыстасць, прынцып справядлівасці і роўнасці. Ды знаходзяцца вельмі дасціпныя заяўнікі, якія хацелі б абысці чаргу. Між іншым, ніводзін з кіраўнікоў, што выслухоўвае іх звароты, не дае неабгрунтаваных абяцанняў: правіла, агульнае для ўсіх.

На «прамую лінію» часта звяртаюцца грамадзяне з пытаннямі, якія немагчыма вырашыць адразу. Яны патрабуюць карпатлівага аналізу, дэталёвага вывучэння з выездам на месца зацікаўленых службаў, спецыялістаў. Да таго ж, заяўнікі не заўсёды дакладна абмалёўваюць сітуацыю, даводзіцца цярпліва высвятляць дэталі, сутнасць звароту. Здараецца і так, што чалавек перабольшвае праблему, а то і наогул, як потым становіцца вядома, хітрыць, падманвае. Так, у Мінаблвыканкам звярнулася жанчына з Заслаўя. Гаспадыня вырошчвае гародніну на прысядзібным участку, а прадаваць няма дзе. У Мінскім райвыканкаме, маўляў, абяцалі вызначыць месцы для гандлю, але не зрабілі гэтага. Старшыня райвыканкама паведаміў, што ў Заслаўі спецыяльна адведзены месцы, дзе можна прадаць прадукцыю з асабістага падворка. Для гэтага неабходна звярнуцца ў адміністрацыю гандлёвага цэнтра для заключэння дагавора арэнды. З Маладзечна паскардзіліся на якасць будаўніцтва дома: вентыляцыя прамярзае, у кватэры цвіль. Маўляў, у недаробках вінаватыя праекціроўшчыкі. На самой справе выявілася, што на кухні вентыляцыйны канал працуе не на поўную магутнасць: на тры чвэрці закрыты выцяжкай. У гэтым вінаваты самі гаспадары. Разам з тым праектнай арганізацыі даручана пракантраляваць сітуацыю ў зімовы перыяд. І ў тым выпадку, калі на столі будуць з'яўляцца плямы, прадугледзець варыянты, як вырашыць праблему.

— Бясспрэчна, ёсць пытанні, якія не патрабуюць вялікіх фінансавых затрат і высілкаў. Яны вырашаюцца хутка, — распавяла **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Мінаблвыканкама Аксана ТАРАНДА.** — Жыхары Мачулішчаў скардзіліся на стан каналізацыйных сетак. Спецыялісты правялі пазапланавую прамыўку сістэмы, і цяпер яна працуе ў штатным рэжыме. З Сеніцы патэлефанавалі, што дрэнна працуе вентыляцыйная сістэма. Цяпер яна прачышчана. Вілейская жыллёва-камунальная гаспадарка паведаміла, што выкананы работы па адводзе вады з участка заяўніцы. Салігорскі райвыканкам даў адказ, што праведзены ямачны рамонт пад'езду да дома №61 па вуліцы Кастрычніцкай, тут устаноўлены сметніцы, пафарбаваны лаўкі. Бацькі вучняў Смалявіцкай сярэдняй школы №2 паскардзіліся на недахоп гурткоў па інтарэсах для малых. У выніку індывідуальнаму прадпрымальніку прадастаўлена ў арэнду памяшканне для правядзення заняткаў для дзяцей малодшага школьнага ўзросту на базе ўстановы адукацыі. Пасля гэтага з такой жа просьбай звярнуліся і бацькі выхаванцаў школы №3. Раённы аддзел адукацыі накіраваў у выканкам пісьмо для ўзгаднення дагавора арэнды, дазвол атрыманы.

Ніводзін з кіраўнікоў, што выслухоўвае звароты, не дае неабгрунтаваных абяцанняў: правіла агульнае для ўсіх.

Сапраўды, дзякуючы «прамым лініям» жыхары вобласці атрымліваюць і кампетэнтныя адказы на ўсе запыты, а многія, калі іх прэтэнзіі, скаргі абгрунтаваныя, дапамогу. Знаходзяцца і тыя, хто не забывае патэлефанаваць паўторна, але не з чарговай просьбай, а з падзякай. У прыватнасці, жыхарка Смалявіч знайшла час, каб выказаць словы ўдзячнасці за добраўпарадкаванне пад'езда да шматкватэрнага дома, дзе яна пражывае.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

Запытаць і вырашыць

Ужо традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі не губляюць папулярнасці. Жыхароў краіны цікавяць як сезонныя праблемы, так і тэмы, актуальныя круглы год: пытанні ЖКГ, адукацыі, транспарту і жылля. Кожны тыдзень на прамыя «гарачыя тэлефоны» звяртаецца каля тысячы жыхароў краіны. Многія пытанні атрымліваецца вырашыць фактычна адразу. Чарговая сувязь будзе наладжана і ў гэтую суботу, 25 ліпеня, з 9.00 да 12.00.

На званкі адкажуць:

Брэсцкі аблвыканкам

намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121),

Віцебскі аблвыканкам

старшыня ШАРСТНЁЎ Мікалай Мікалаевіч (80212204260),

Гомельскі аблвыканкам

намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237),

Гродзенскі аблвыканкам

першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644),

Мінскі аблвыканкам

намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160),

Магілёўскі аблвыканкам

старшыня абласнога Савета дэпутатаў ІСАЧЭНКА Анатоль Міхайлавіч (80222501869)

Мінскі гарвыканкам

намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

Нагадаем, у Беларусі ў бягучым годзе арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

■ Кашалёк

НЕАБГРУНТАВАНАГА РОСТУ ЦЭН НЕ БУДЗЕ

Пра гэта паведаміла намеснік міністра гандлю Беларусі Ірына Наркевіч, якая адзначыла, што сёлета па тых групах тавараў, цэны на якія рэгулююцца Мінгандлю, цэннікі ўвогуле засталіся стабільнымі.

У РЭЖЫМЕ РЭКАМЕНДАЦЫЙ

У прыватнасці, яна адзначыла, што цяпер Міністэрства гандлю працягвае кантраляваць змяненне цэн на спажывецкія тавары і патрабуе не дапускаць іх неабгрунтаванага росту. А па рэгуляваных групах тавараў павышэння коштаў не было з пачатку года. Больш за тое, сёння Мінгандлю вызначыў памеры гандлёвых надбавак (у якасці рэкамендацый) на нерэгуляваныя віды тавараў, прапанаваў рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і мясцовым выканаўчым органам і канцэрнам наладзіць сістэмную работу ў падведамасных арганізацыях па зніжэнні выдаткаў вытворчасці ў мэтах недапушчэння росту коштаў на сваю прадукцыю.

Паводле слоў Ірыны Наркевіч, ведамства пастаянна ажыццяўляе кантроль за сітуацыяй на спажывецкім рынку і сочыць за ростам цэн на тавары. Сёння гэтая сітуацыя стабільная, упэўнена намеснік міністра, што пацвярджаецца статыстычнымі звесткамі. Напрыклад, сёлета ў студзені інфляцыя склала 2,4%, у лютым — 1,7%, у той жа час курс долара за першы месяц года павялічыўся амаль на 30%. «Пасля стабілізацыі сітуацыі на валютным рынку інфляцыя ў краіне штомесяц не выходзіць за параметр ў 1%. Так, у сакавіку гэты параметр склаў 0,8%, у красавіку — 0,9%, а ў маі і чэрвені — 0,7%», — патлумачыла Ірына Наркевіч.

Мінгадлю больш не збіраецца проста сачыць за дзеяннем розных аператараў на спажывецкім рынку, а будзе актыўна кантраляваць выкананне заканадаўства аб цэнаўтварэнні. А пры неабходнасці можна і карэктаваць узровень рэгуляваных гранічных максімальных гандлёвых надбавак да адпускных цэн на сацыяльна значныя тавары для арганізацый гандлю ўсіх формаў уласнасці і падпарадкаванасці. Паводле яе слоў, адной з дзейсных мер з'яўляецца аператыўнае ўвядзенне цэнавага рэгулявання тэрмінам на 90 дзён на вызначаны пералік сацыяльна значных тавараў у выпадку ўзнікнення крытычнай сітуацыі на спажывецкім рынку па канкрэтнай таварнай пазіцыі. Акрамя таго, міністэрства лічыць мэтазгодным рэгулярна праводзіць стокавыя акцыі, кірмашы-распродажы айчынных тавараў па зніжаных цэнах.

БЕЗ АЖЫЯТАЖУ І ДЭФІЦЫТУ

Галоўным вынікам працы гандлёвай галіны ў першым паўгоддзі Ірына Наркевіч лічыць захаванне стабільнай сітуацыі на ўнутраным спажывецкім рынку, калі назіраецца шырокі асартымент харчовых і нехарчовых тавараў, у большай частцы айчыннай вытворчасці. Калі няма дэфіцыту, то і адсутнічае ажыятаж, лічыць спадарыня Наркевіч.

Паводле яе слоў, галіна актыўна развіваецца, што пацвярджаецца перавыкананнем прагнозных тэмпаў росту рознічнага таваразвароту ў супастаўных цэнах. Так, у

Такія завалы на пошце нам не пагражаюць, прынамсі пакуль.

2011 годзе ён склаў 109%, у 2012 годзе — 114,1%, 2013 — 118%, у 2014 годзе — 106%. Атрымліваецца, што за апошнія 5 гадоў рознічны таваразварот у супастаўных цэнах павялічыўся у 1,6 раза.

Ірына Наркевіч падкрэсліла, што цяпер доля гандлю ў ВУП краіны складае 12,2%, а гэта другое месца сярод галін эканомікі пасля апрацоўчай прамысловасці. «У краіне цяпер назіраюцца станоўчыя тэмпы развіцця галіны — рост рознічнага таваразвароту ў першым паўгоддзі сёлета склаў 101,1%», — адзначыла Ірына Наркевіч. Вядома, што ў I квартале сёлета ў гандаль прыцягнута каля 268 млн доларaў, ці 26,7% ад агульнарэспубліканскага аб'ёму прамых замежных інвестыцый. А менавіта стабільны прыток замежнага капіталу на працягу апошніх гадоў стаў добрай асновай для далейшага развіцця.

ІМПАРТ ЗМЕНШЫЦЬ ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ

Для ажыццяўлення больш актыўных продажаў уласнай прадукцыі Мінгандлю выступае за ўвядзенне льготнага спажывецкага крэдытавання айчынных тавараў.

Менавіта ў мэтах павелічэння долі продажаў прадукцыі айчыннай вытворчасці, зніжэння імпарту такіх тавараў, а таксама для сацыяльнай падтрымкі насельніцтва міністэрствам падрыхтаваны праект указа, які прадугледжвае прадастаўленне льготных спажывецкіх крэдытаў у парадку, у асноўным аналагічным Указу ад 6 ліпеня 2009 г №371.

Разам з тым Ірына Наркевіч адзначыла, што Мінгандлю сумесна з галіновымі ведамствамі і канцэрнамі, вытворцамі і арганізацыямі гандлю выкарыстоўваецца шэраг захадаў для прыярытэтнага забеспячэння ўнутранага рынку менавіта айчыннай прадукцыяй ва ўмовах максімальнай яго адкрытасці. Паводле яе слоў, сёння доля айчынных тавараў на ўнутраным рынку істотна пераважвае. А па харчовай групе ён больш чым на 80% забяспечваецца за кошт айчыннай прадукцыі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Дарэчы

Пакупнікі замежных інтэрнэт-крам могуць трапіць пад дадатковы збор

Ідэю аб увядзенні збору пры куплі тавараў у замежных інтэрнэт-крамах зноў агучыла ўчора намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч.

На яе погляд, Мінгандалю і міжнародная практыка стаяць на абароне ўнутранага рынку. Міністэрства ў першую чаргу зацікаўлена, каб развіваўся дробны гандаль айчыннымі таварамі і праз нашы анлайн-крамы. А для гэтага трэба распрацаваць спецыяльны ахоўны механізм на рынку, лічыць намеснік міністра. Паводле яе слоў, «цяпер абмяркоўваюцца методыка збірання, сума такога збору і г.д». Нядаўна Нацбанк даручыў камерцыйным банкам разгледзець тэхнічную магчымасць збірання дадатковага збору з фізічных асоб пры куплі тавараў у замежных інтэрнэт-крамах. Аднак банкі адказалі рэгулятару, што не маюць тэхнічнай магчымасці браць такі падатак у момант аплаты карткай. Праўда, такі адказ Мінгандлю не задаволіў.

Ірына Наркевіч адзначыла, што спяшацца з укараненнем такой ініцыятывы не варта, а трэба дасканала вывучыць міжнародны вопыт, адаптаваць яго на беларускі рынак, улічваць асаблівасці Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэта так, але ад самой ідэі ўвядзення дадатковага збору ў Мінгандлю не адмаўляюцца.

НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ

ЭКАНОМІКА ЧАКАЕ...

Станоўчая тэндэнцыя па першым паўгоддзі назіраецца ў сельскай гаспадарцы і будаўніцтве жылля

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, валавы ўнутраны прадукт краіны сёлета ў студзені-чэрвені склаў 404,5 трлн рублёў.

Спецыялісты камітэта адзначаюць, што за гэты час прамысловай прадукцыі было выраблена на агульную суму 352,14 трлн рублёў, што на 7,4% менш, чым за студзень — чэрвень летась. Удзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай склала 13,2%. Між іншым, сёлета сельскагаспадарчай прадукцыі (у гаспадарках усіх катэгорый) выраблена на 42,1 трлн рублёў. У выніку прырост да першага паўгоддзя летась склаў 2,7%.

Эксперты адзначаюць, што ў студзені-чэрвені за кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 2 млн 747,8 тысячы квадратных метраў жылля, што на 1,4% больш у параўнанні з адпаведным перыядам летась.

Сяргей ПАЛІНІН. *kurkach@zviazda.by*

А МЫ ЯЧМЕНЬ УЖО ЎБРАЛІ!

Як паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, ураджайнасць азімага ячменю ў Беларусі сёлета вышэйшая за мінулы год. Яго ўборка па ўсёй краіне завяршаецца. Жалі ўжо з 7,3 тыс. га, што складае каля 95% ад засеяных плошчаў. Дарэчы, гаспадаркі Мінскай вобласці, якім трэба было прыбраць 0,3 тыс. га, цалкам справіліся з заданнем.

Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, сёлета сярэдняя ўраджайнасць азімага ячменю складае 43,6 ц/га, што на 2,9 ц/га больш, чым летась. Агульны намалот складае 32 тыс. тон.

Таксама ў гаспадарках Беларусі завяршаецца ўборка азімай свірэпіцы на зерне — яе ўбрана каля 94,2%. Аграрыі паспелі прыступіць да ўборкі азімага рапсу — з 152,4 тыс. га ўжо прыбралі 37,5 тыс. Намалочана больш за 80 тыс. тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 21,5 ц/га, што крыху менш, чым у 2014-м (21,7 ц/га).

Аграрыі ўжо нарыхтавалі 650 тыс. тон сена (46,4% ад плана), 8 млн 831,5 тыс. тон сенажу (65,4%), з якіх 18,2% — у палімернай упакоўцы. Сіласу нарыхтавана пакуль толькі каля 1,6% ад плана, што складае 222 тыс. тон з неабходных 14 млн 91,6 тыс. тон. Травяных кармоў нарыхтавалі каля 35% — 2 млн 918 тыс. тон з запланаваных амаль 8 млн 400 тыс тон.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

ІЛЖЭРАБОТНІЦА ПОШТЫ ПАДМАНУЛА... ВЕТЭРАНА ВАЙНЫ

Махлярка зайшла ў дом 86-гадовага пенсіянера з Лунінецкага раёна, калі той спаў. Разбудзіла мужчыну, сказала, што працуе ў паштовым аддзяленні, прапанавала набыць у яе коўдру і плед. Разгаварыліся — і ветэран Вялікай Айчыннай вайны паказаў госці свае зберажэнні з выплат да 9 Мая і з апошняй пенсіі. Убачыўшы немаленькую суму, ілжэсупрацоўніца адразу ж ажывілася, параіла набыць пенсіянеру дзве коўдры. Цана, аднак, чамусьці вырасла, але жанчына паабяцала, што вялікую частку ад яе яму вернуць праз пошту. «Даверлівы пенсіянер, паддаўшыся чарам махляркі, растаўся з 8 600 000 беларускіх рублёў, — паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці. — Толькі калі няпрошаная госця пакінула дом, у ветэрана ўзніклі падазрэнні...» Распачата крымінальная справа па ч. 1 арт. 209 КК — «Махлярства».

Надзея ПАЎЛАВА.

КЛЮЧ ДА СЭРЦА І ГРОШАЙ

Грамадзяніна Грузіі Бачука Цібуа затрымалі ў аэрапорце «Мінск-2», калі ён накіроўваўся адбыць у Тбілісі. Мужчыну 48 гадоў перавезлі ў Гомель, дзе заведзены чатыры крымінальныя справы. Па ўсіх ён праходзіць абвінавачваным у серыі махлярстваў, здзейсненых у горадзе над Сожам.

Супрацоўнікі ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама сумесна з аператыўнікамі Савецкага РАУС і пры непасрэднай дапамозе мінскіх калег правялі складаную аперацыю па выкрыванні злачынца, які доўгі час знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку.

Цяпер вядома, што ў Гомель яго запрасіла знаёмая праз сацыяльную сетку жанчына. Пакуль гарачы джыгіт быў у абласным цэнтры, ён зачараваў яшчэ дзвюх жанчын. Пацярпелыя заявілі, што грамадзянін завалодаў не толькі іх грашыма, але і залатымі вырабамі. Зараз агульная сума прычыненай шкоды складае больш за $12 тысяч.

Аднак аператыўнікі не выключаюць, што колькасць ахвяр можа быць большай, бо ашуканец гастраляваў па краінах СНД. У сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пацярпелыя ад яго дзеянняў стварылі групу, прысвечаную вышуку Бачука Цібуа. Перадача на гэтую тэму прайшла на адным з тэлеканалаў Украіны. Вядома, што там ён таксама пакінуў крымінальны след. Магчымых ахвяр махляра на даверы праваахоўнікі просяць не саромецца звяртацца ў міліцыю ці Следчы камітэт.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *astashkevich@zviazda.by*

КРЫМІНАЛЬНЫ ХАКЕЙ

Былога генеральнага дырэктара хакейнага клуба «Дынама» падазраюць у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі

Следчы камітэт ужо завёў крымінальную справу ў дачыненні былога кіраўніка клуба. Справа заведзена па выніках аператыўна-вышуковай дзейнасці Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС РБ.

У Следчым камітэце паведамілі, што дзеянні экс-дырэктара кваліфікаваны па ч. 3 арт. 424 (злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, якія пацягнулі за сабой цяжкія наступствы ў выглядзе прычынення ўрону ў асабліва буйным памеры).

Падазраваны затрыманы, з ім працуюць следчыя.

З 2013 года генеральным дырэктарам «Дынама» быў Максім Суботкін. 20 ліпеня яго афіцыйна звольнілі з пасады. Фармулёўка — «за грубае парушэнне службовых паўнамоцтваў».

«ЛІПАВЫЯ» ПАГОНЫ

Чацвёра жыхароў Міншчыны выкарыстоўвалі міліцэйскую ўніформу, каб рабаваць, гвалціць і здзекавацца з прастытутак. У дачыненні да іх заведзены крымінальныя справы.

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС РБ паведамілі, што праваахоўнікі звярнулі ўвагу на гэтых асоб (узрост ад 24 да 29 гадоў) яшчэ летась. Падазраваныя пазнаёміліся за кратамі. На волю выйшлі каля двух гадоў таму. Тады і вырашылі здзейсніць даволі спецыфічнае злачынства. Яны разумелі нелегальны статус прастытутак, знаёміліся з імі, а пасля паведамлялі, што «мы — міліцыянеры». Для пераканаўчасці апраналі спецыяльныя кашулі, шаўроны, пагоны, выкарыстоўвалі падробленыя пасведчанні супрацоўнікаў МУС, кабуры з пнеўматычнымі пісталетамі.

Фальшывыя праваахоўнікі адымалі ў жанчын грошы, гвалцілі іх, а пасля вывозілі за горад, дзе пад пагрозай помсты патрабавалі ад іх маўчання. Некаторых утрымлівалі дома па некалькі дзён і здзекаваліся з іх. Падобны «крымінальны квартэт» затрымалі ў чэрвені. Вядома, што ад злачынцаў пацярпелі больш за 10 жанчын. Трое ўдзельнікаў знаходзяцца ў следчым ізалятары №1, яшчэ аднаго адпусцілі пад абавязацельства аб яўцы.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Гучная справа

ЗАСТРЭЛІЎ ЖОНКУ І ЦЕШЧУ

За падвойнае забойства лунінчаніну пагражае найвышэйшая мера пакарання

Трагедыя адбылася ў шматпавярховіку ў цэнтры Лунінца. Каля сямі гадзін раніцы, знаходзячыся ў сябе дома, 42-гадовы лунінчанін застрэліў з паляўнічай стрэльбы жонку і цешчу — 37 і 56 гадоў адпаведна. Відавочцай забойства стала 14-гадовая пляменніца гаспадыні дома, якая напярэдадні прыйшла ў госці да цёткі.

Пасля злачынства мужчына выбег з кватэры. Стрэльбу выкінуў у суседнім двары па дарозе да знаёмага. Там яго і затрымалі супрацоўнікі міліцыі. У забойцы засталіся двое дзяцей: дачка 18 гадоў, якая пражывае асобна ад бацькоў, і 12-гадовы сын, які ў момант забойства выгульваў сабаку.

«Мужчына абвінавачваецца ў здзейсненні асабліва цяжкага злачынства па ч. 2 арт. 139 КК (забойства дзвюх асоб), — адзначыў намеснік старшыні Брэсцкага абласнога суда Мікалай Сіз. — Санкцыя артыкула прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 25 гадоў, пажыццёвае зняволенне або смяротнае пакаранне». Справу аб падвойным забойстве разглядае калегія па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда.

Надзея ПАЎЛАВА.

■ Аты-баты

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ!

Днямі вынікі ўступнай кампаніі падводзілі ў Інстытуце пагранічнай службы. Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, хто шукае для сябе нялёгкую долю ахоўніка дзяржаўнай мяжы.

...Суботняй раніцай у актавай зале культурна-забаўляльнага цэнтра інстытута няма вольных месцаў. Амаль дзве сотні абітурыентаў разам са сваімі бацькамі прыехалі з усіх куткоў краіны і ў хваляванні чакаюць абвяшчэння вынікаў. З гэтых амаль дзвюх соцень на першы курс залічаць толькі 100. Яшчэ 4 чалавекі будуць вучыцца ў Калінінградскім пагранічным інстытуце.

Наступныя чатыры гады хлопцы будуць вучыцца самастойнасці.

— Папярэднія вынікі прыёмнай кампаніі нас задаволілі, — распачаў мерапрыемства **начальнік Інстытута пагранічнай службы, палкоўнік Васіль ГЕДЗЬКО.** — Па спецыяльнасці «Упраўленне падраздзяленнямі граніц» прахадны бал быў 152, «Упраўленне падраздзяленнямі пагранічнага кантролю» — 166, па спецыяльнасці «Аператыўная дзейнасць органаў пагранічнай службы» — 141 і «Ідэалагічная работа ў органах пагранічнай службы» — 143 балы.

Пачалося абвяшчэнне прозвішчаў тых, хто атрымаў чаканае месца на студэнцкай (ці, лепш сказаць, курсанцкай) лаве. Залішняй эмацыянальнасці, скокаў і радасных крыкаў тут не было — хлопцы быццам бы пацвярджалі сваю прафпрыгоднасць і стрымана ўсміхаліся, паціскалі рукі бацькам, абдымалі знакамі ў атэстаце па экзаменацыйных прадметах (адной з дзяржаўных моў, матэматыцы і гісторыі). Такія абітурыенты будуць залічвацца ў інстытут па-за конкурсам. Акрамя таго, калі за першы месяц навучання з'явіцца і першыя адлічаныя, на іх месцы заступяць тыя, хто не прайшоў па балах.

— Сёлета мы ўпершыню набіралі абітурыентаў на чатыры новыя спецыяльнасці, — распавядае **першы намеснік начальніка Інстытута пагранічнай службы, палкоўнік Сяргей ВОЛКАЎ.** — Таму, безумоўна, адчувалі пэўнае хваляванне. Але вынік атрымаўся добры — прахадны бал заўважна вырас у параўнанні з мінулымі гадамі. Шмат абітурыентаў паступала па-за конкурсам: выпускнікі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча з сярэднім балам атэстата не ніжэй за 7, выпускнікі кадэцкіх вучылішчаў і салдаты, якія праходзяць тэрміновую службу з не ніжэйшым за 6 балам па экзаменацыйных прадметах.

Ужо 31 ліпеня навaспечаныя курсанты прыбудуць у інстытут. Праз 2 дні яны накіруюцца ў вучэбны цэнтр пад Смаргонню, дзе іх чакае курс маладога байца, а напрыканцы жніўня прымуць прысягу на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Потым — чатыры гады старannай вучобы.

Але курсанцкае жыццё пачынаецца для іх ужо сёння. Акрамя традыцыйнага запаўнення анкет і афармлення дакументаў, хлопцаў чакае шэраг «сакральных» працэдур, напрыклад абмерка. У фае будынка ўсталявана мінілабараторыя для зняцця антрапаметрычных паказчыкаў. Ужо 31 ліпеня курсанты атрымаюць некалькі камплектаў новай формы. З жартам пытаемся ў супрацоўнікаў, ці моцна худзеюць курсанты за час навучання. Аказваецца, зусім наадварот — набіраюць вагу, але месца тлушчу займаюць мышцы.

Увогуле, варта сказаць, што навучэнцаў тут забяспечваюць усім неабходным. З асабістых рэчаў ім нічога не спатрэбіцца — усё дае дзяржава. Але патрабуюць адпаведных адносін

— Цяпер абітурыенты (ці, можна смела сказаць, — будучыя курсанты) запаўняюць паперы для атрымання грашовага забеспячэння, — кажа **намеснік начальніка аддзела кадраў і ўліку асабовага складу, падпалкоўнік Юрый КАЛЯДА.** — На першым курсе яны будуць атрымліваць 1,8 мільёна рублёў. Таксама заключаем кантракты на час навучання і пяць гадоў службы на афіцэрскіх пасадах пасля яго завяршэння. У кантракце прапісаны абавязкі бакоў, у тым ліку — умовы датэрміновага скасавання. Калі курсанта адлічваюць з інстытута, яму даводзіцца пакрываць выдаткі дзяржавы на падрыхтоўку.

Будучы курсант Уладзіслаў Шпакоўскі са сваёй сям'ёй.

У сярэднім навучанне аднаго афіцэра-пагранічніка каштуе дзяржаве прыкладна 150 мільёнаў рублёў за год. Таму, калі курсант будзе адлічаны, напрыклад, з другога курса, вяртаць прыйдзецца ўжо 300 мільёнаў. Неблагая матывацыя старанна вучыцца і трымаць дысцыпліну.

Але тут не імкнуцца кагосьці напужаць. Наадварот, пра тое, што чакае будучых курсантаў, можна адразу даведацца ў старшакурснікаў, якія выконваюць ролю своеасаблівых «гідаў».

— Мы кансультуем абітурыентаў па ўсіх пытаннях, — расказваюць **чацвёртакурснікі Яўген ТРАЯН і Аляксандр КЕРНАЖЫЦКІ.** — Пытанні самыя розныя, ад «Што з сабой узяць?» і «Ці націраюць берцы?» да «Ці цяжка тут увогуле вучыцца?». Яшчэ адно распаўсюджанае пытанне датычыцца мабільных тэлефонаў, але адказ просты — карыстацца можна толькі ў вольны ад вучобы час. Асабліва хвалююцца не столькі будучыя курсанты, колькі іх бацькі. Насамрэч перажываць няма чаго — наперадзе хлопцаў чакае самае цікавае: першыя заняткі, паездкі ў цікавыя месцы. Галоўнае, што павінен мець курсант — гэта патрыятызм: калі ён ёсць — усё атрымаецца.

Аляксандр ПРАНЕВІЧ прыехаў у Мінск з Драгічына. Сёлета Інстытут пагранічнай службы закончыў яго старэйшы сын, малодшы пайшоў па тым жа шляху і таксама выбраў гэту ВНУ.

— Безумоўна, мяне перапаўняе гонар за сваіх дзяцей, — дзеліцца мужчына. — У нас у сям'і не было вайскоўцаў, але мы заўсёды казалі хлопцам, што афіцэр — гэта прыклад маральнай чысціні, дысцыпліны, можа, таму яны і выбралі такую будучыню. Калі меркаваць па старэйшым сыне, то яго вучоба змяніла вельмі моцна. Ён стаў больш адказным, больш сур'ёзным, ну і, вядома, больш мужным. Чакаем такіх жа змен і ад малодшага.

«У мяне ў сям'і шмат вайскоўцаў, — кажа **будучы курсант Уладзіслаў ШПАКОЎСКІ.** — Таму з дзяцінства я на свае вочы бачыў, што сабой уяўляе служба. І выбар, чым заняцца пасля школы, зрабіць было няцяжка. Дзядуля служыў пагранічнікам, таму я працягваю дынастыю. Ад вучобы і службы чакаю ў першую чаргу набыцця новых прафесійных якасцяў і паспяховай кар'еры. Гэтага ж хочуць і мае родныя.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Падрыхтоўка да вучобы пачынаецца ўжо сёння.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Яшчэ больш фота на сайце zviazda.by

Надыхацца вішнёвым водарам

Ці чулі вы, што ў горадзе Глыбокае знаходзіцца магіла і помнік Мюнхгаўзену? Ці то цёзкі, ці то сваяка гэтага легендарнага персанажа. Здаецца, ён вось-вось ажыве і вылеціць са сваёй гарматы, гледзячы ў падзорную трубу. Яшчэ адным упрыгажэннем горада з'яўляецца помнік вішні. Кажуць, калі дакрануцца да апетытнай ягады, а потым абысці вакол яе — збудзецца самае запаветнае жаданне...

У Глыбокім ёсць на што паглядзець і чаму падзівіцца, асабліва падчас Вішнёвага фестывалю, які праходзіць у горадзе трэці раз. У 2012 годзе глыбачане з ідэяй аб правядзенні «ягаднага фэсту» занялі другое месца на III міжнародным форуме «Імідж Беларусі: час дзейнічаць.» І пайшло-паехала.

Напярэдадні першага фестывалю, два гады назад, пры ўездзе ў горад пасадзілі 1414 саджанцаў вішні (менавіта ў 1414 годзе Глыбокае ўпершыню згадваецца ў летапісах), а вуліцу насупраць саду сталі называць Вішнёвай. А сёлета на ўездзе ў горад з'явіўся знак, які «вітае» ўсіх, хто накіроўваецца ў горад па трасе Паставы — Полацк. Выкананы ён у форме сцяны-крэпасці, на якой яшчэ здалёк відаць надпіс «Глыбокае», дата яго першай пісьмовай згадкі ў дакументах і герб горада.

Адзначу, што сад квітнее, на вуліцы Вішнёвай з'яўляюцца новыя дамы, а ў цэнтры горада штогод падчас фэсту ладзяцца выставы, кірмашы, дыскатэкі, тэатралізаваныя паказы, спартландыі, майстар-класы, разнастайныя форумы.

З раніцы ў гандлёвым цэнтры «Родны кут» было людзей столькі, што носа не ўбіць. «Што дзеецца?» — пытаюся я і чую ў адказ голас з натоўпу: — «Ды мы тут вішнёвымі вырабамі частуемся». Праціснуўшыся бліжэй, заўважаю каравaі, пірожныя, тарты (такія прыгожыя, ажно есці шкада). Перада мною былі сапраўдныя кулінарныя шэдэўры з вішнёвым каларытам. Прымяненне галоўным ягадам горада знайшлі не толькі ў райспажыўтаварыстве. На мясцовым малочнакансервавым камбінаце ўжо некалькі гадоў выпускаюць сваю «вішнёвую» згушчанку з араматам шэры-брэндзі.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 18 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

Важно! *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: отдел аукционов — + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** — + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** — + 375 (17) 328 36 58**. Интернет: www.mgcn.by.**

ГАЛОЎНЫ ЦЕЛААХОЎНІК МІКАЛАЙ УЛАСІК

За тры месяцы да смерці Сталін рэпрэсаваў начальніка сваёй аховы генерала Уласіка. Наш зямляк адслужыў яму верай і праўдай чвэрць стагоддзя

Сямнаццатага студзеня 1955 года Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР пад старшынствам палкоўніка юстыцыі Барысаглебскага разгледзела крымінальную справу па абвінавачванні былога начальніка Галоўнага ўпраўлення аховы Міністэрства дзяржаўнай бяспекі СССР генерал-лейтэнанта Уласіка Мікалая Сідаравіча і прызнала яго вінаватым у здзяйсненні злачынства, прадугледжанага арт. 193-17, п. «б» КК РСФСР (злоўжыванне службовым становішчам пры асабліва абцяжваючых абставінах).

Паводле прысуду, Уласік М.С. быў падвергнуты высылцы «ў аддаленую мясцовасць СССР» тэрмінам на пяць гадоў, пазбаўлены воінскага звання «генерал-лейтэнант», чатырох медалёў, двух ганаровых знакаў «ВЧК-ГПУ», а пазней пазбаўлены і іншых узнагарод: трох ордэнаў Леніна, чатырох — Чырвонага Сцяга, ордэнаў Чырвонай Зоркі, Кутузава I ступені і медаля «ХХ гадоў РСЧА». Была таксама «канфіскавана і вернута ў даход дзяржавы маёмасць, набытая злачынным шляхам».

28 чэрвеня 2000 года пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Суда РФ прысуд гэты быў адменены і крымінальная справа ў дачыненні да Уласіка спынена — за адсутнасцю складу злачынства...

Праверка на наяўнасць ядаў ў ежы і наогул кантроль за харчаваннем Сталіна — гэта, праўда, для Уласіка было нескладанай справай — працавалі спецлабараторыі. Карацей, спраў у начальніка аховы хапала, і за ўсе гады ніякіх непрыемнасцяў правадыр не меў, хоць вакол яго надзвычайныя здарэнні адбываліся. І нярэдка: «блокі», «цэнтры», загадкавая смерць Мянжынскага, Куйбышава, Горкага і яго сына Максіма, спроба атручэння парамі ртуці Яжова, забойства Кірава, Арджанікідзэ, гібель Чкалава... Гэта сёння мы больш-менш ведаем, што і як там адбывалася на самай справе. А тады ўся краіна жыла ў страху.

Такім чынам да лета 1941-га Уласік ужо меў генеральскі чын. Падчас вайны клопатаў дадалося, адпаведна і штат разросся — да некалькіх дзясяткаў тысяч чалавек. Уласіку была даручана эвакуацыя ўрада, членаў дыпкорпуса і наркаматаў. Галоўнае ўпраўленне аховы падбірала ў Куйбышаве працоўныя памяшканні і кватэры для эвакуяванага кіраўніцтва, забяспечвала транспартам, сувяззю, наладжвала забеспячэнне. За эвакуацыю цела Леніна ў Цюмень і яго ахову таксама адказваў Уласік. А ў Маскве ён са сваім апаратам клапаціўся аб бяспецы на парадзе 7 лістапада 1941 года, на ўрачыстым сходзе, які правялі на станцыі метро «Маяковская» напярэдадні.

Карацей, службу яго «мёдам» не назавеш. А тут яшчэ і «дробныя» пытанні.

Сакрэтна
Нам. начальніка 1-га аддзела НКУС СССР камісару дзяржбяспекі 3 ранга
т. Уласіку М.С.
Заключэнне аб стане здароўя палкоўніка СТАЛІНА Васіля Іосіфавіча

т. СТАЛІН В.І. дастаўлены ў крамлёўскую бальніцу 4/IV-43 г. у 11 гадзін па прычыне раненняў асколкамі снарада. Раненне левай шчакі з наяўнасцю ў ёй дробнага металічнага асколка і раненне левай ступні з пашкоджаннем костак яе і наяўнасцю буйнога металічнага асколка. У 14 гадзін 4/IV-43 г. пад агульным наркозам праф. А.Д. Ачкіным праведзена аперацыя сячэння пашкоджаных тканак і выдалення асколкаў. Раненне ступні адносіцца да разраду сур'ёзных. У сувязі з забруджваннем ран уведзены супрацьслупняковая і супрацьгангрэнозная сываратки. Агульны стан параненага цалкам здавальняючы.

Начальнік Лечсанупра Крамля (Бусалаў)

Перш чым дакладваць бацьку пра сына, Мікалай Сідаравіч прымусіў камандаванне ВПС прадставіць данясенне пра абставіны ранення Васіля Сталіна. Доўга чакаць гэтага не давялося.

ЗАГАДВАЮ:

1) Неадкладна зняць з пасады камандзіра авіяцыйнага палка палкоўніка СТАЛІНА В.І. і не даваць яму якіх-небудзь камандных пастоў надалей да майго распараджэння.

2) Палку і былому камандзіру палка палкоўніку Сталіну абвясціць, што палкоўнік Сталін здымаецца з пасады камандзіра палка за п'янства і разгул і за тое, што ён псуе і разбэшчвае полк.

3) Выкананне данесці.

Народны камісар абароны І. Сталін
26 мая 1943 года

Але былі справы і больш сур'ёзныя.

Перш за ўсё — тры канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін антыгітлераўскай кааліцыі: Тэгеран (28.XI — 1.XII. 1943), Ялта (4-11.II.1945) і Патсдам (17.VII — 2.VIII.1945). І заўсёды Уласік быў побач са Сталіным — маскіраваўся пад фотакарэспандэнта. За паспяховае правядзенне канферэнцыі ў Тэгеране Уласік быў узнагароджаны ордэнам Леніна, за Крымскую канферэнцыю — ордэнам Кутузава I ступені, за Патсдамскую — ордэнам Леніна.

Асабліва небяспечна было ў 1943-м у Тэгеране. Кажуць, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Чэрчыль быў у люстасці і заявіў, што прэзідэнт Рузвельт, «прыбыўшы з-за акіяна, страціў галаву», трапіў пад поўны ўплыў Сталіна. Ён звярнуў увагу на тое, што ў ходзе ўсёй канферэнцыі прэзідэнт ЗША пражываў разам са Сталінам у савецкім пасольстве і таму, маўляў, савецкаму кіраўніку было лёгка апрацаваць прэзідэнта Злучаных Штатаў у сваім духу. Калі ж амерыканскія журналісты спыталі Рузвельта аб прычынах яго пражывання ў рускіх, то прэзідэнт бясхітрасна сказаў наступнае:

«Маршал Сталін паведаміў, што, магчыма, будзе арганізаваная змова з мэтай замаху на жыццё ўдзельнікаў канферэнцыі: у Тэгеране — сотні германскіх шпіёнаў і дыверсантаў. Ён прасіў мяне спыніцца ў савецкім пасольстве, якое лепш умацавана і абаронена».

«Я быў жорстка пакрыўджаны Сталіным. За 25 гадоў бездакорнай працы, не маючы ніводнага спагнання, а толькі адны заахвочванні і ўзнагароды, я быў выключаны з партыі і кінуты у турму. За маю адданасць ён аддаў мяне ў рукі ворагаў. Але ніколі, ніводнай хвіліны, у якім бы стане я ні знаходзіўся, якім бы здзекам я не падвяргаўся, знаходзячыся ў турме, я не меў у сваёй душы зла на Сталіна...»

Такім чынам, звесткі аб меркаваным замаху на «вялікую тройку» вымусілі Рузвельта ў ходзе канферэнцыі пасяліцца на тэрыторыі савецкага пасольства. Пасля чаго Сталін атрымаў магчымасць весці размовы з прэзідэнтам ЗША сам-насам, без прысутнасці Чэрчыля. Зразумела, што тым самым кіраўнік савецкай дзяржавы атрымаў дадатковыя козыры ў сваёй няпростай палітычнай гульні... У гэтай гісторыі шмат няяснага. І галоўнае пытанне — ці была на самай справе пагроза такога нямецкага замаху — застаецца і сёння без дакладнага адказу.

Тая гісторыя ўжо даўно абрасла мноствам прыгожых легендаў. Лічыцца, што падчас Тэгеранскай канферэнцыі фашысцкая разведка рыхтавала звышсакрэтную аперацыю пад назвай «Доўгі скачок». Яе мэтай было забойства Сталіна, Рузвельта і Чэрчыля. Аднак савецкім чэкістам удалося прадухіліць гэтую акцыю. У 70-я гады аб гэтай інтрыгуючай гісторыі быў нават зняты прыгодніцкі фільм «Тэгеран-43». Пасля выхаду фільма савецкая прапаганда пастаралася падмацаваць яго дакументальнымі сведчаннямі. У прыватнасці, гаварылася, што пра злавесныя намеры гітлераўцаў выпадкова даведаўся знакаміты савецкі разведчык Мікалай Кузняцоў, які дзейнічаў на тэрыторыі акупаванай Украіны пад імем обер-лейтэнанта вермахта Паўля Зіберта.

Ялта. 1945

Сакрэтна
Экз. №1
Данясенне аб надзвычайным здарэнні ў 32-м гвардзейскім ЗАП (знішчальна-авіяцыйны полк. — Рэд.)

Здарэнне адбылося пры наступных абставінах: 4 красавіка 1943 г. раніцай група лётнага саставу, якая складалася з камандзіра палка палкоўніка Сталіна В.І., Герояў Савецкага Саюза падпалкоўніка Уласава Н.І., капітана Баклан А.Я., капітана Котава А.Г., капітана Гараніна У.І., капітана Папкова У.І., капітана Далгушына С.Ф., камандзіра звяна старшага лейтэнанта Шышкіна А.П. і іншых, а таксама інжынера па ўзбраенні палка капітана Разіна Я.І., выехала на раку Селіжараўка, якая знаходзіцца за 1,5 км ад аэрадрома, па рыбу. Кідаючы ў ваду гранаты і рэактыўныя снарады, глушылі рыбу, збіраючы яе з берага сачком. Перад кіданнем рэактыўнага снарада інжынер палка капітан Разін папярэдне ставіў кольца дэтанатара на максімальнае запаволенне (22 секунды), а затым кідаў снарад у ваду. Так ім асабіста былі кінуты 3 рэактыўныя снарады. Рыхтуючыся да кідка апошняга рэактыўнага снарада, інжынер-капітан Разін дапусціў памылку, і імгненна адбыўся выбух снарада ў руках, у выніку чаго адзін чалавек — капітан Разін — забіты, палкоўнік Сталін В.І. і капітан Котаў А.Г. цяжка паранены.

З гэтым данясеннем верны Мікалай Сідаравіч пайшоў да правадыра, і той тут жа адказаў загадам:

Камандуючаму ВПС Чырвонай Арміі
Маршалу авіяцыі тав. Новікаву

Нібыта Кузняцову ўдалося пасябраваць са штурмбанфюрэрам СС Ульрыхам фон Ортэлем, супрацоўнікам германскай разведкі. І той аднойчы па «п'янай лавачцы» прагаварыўся аб тым, што хутка ён адправіцца ў Іран з сакрэтнай місіяй, каб знішчыць лідараў краін антыгітлераўскай кааліцыі. Ортэль так і сказаў Кузняцову: «Мы ліквідуем «вялікую тройку» і павернем ход вайны». Паводле яго слоў, аперацыяй будзе кіраваць не хто-небудзь, а ўлюбёнец Гітлера, штандартэнфюрэр СС Ота Скарцэні, які не так даўно са сваімі дыверсантамі здолеў скрасці ў саюзнікаў узятага ў палон італьянскага дыктатара Беніта Мусаліні.

Інфармацыя была тэрмінова перададзена ў Маскву, там прынялі ўсе неабходныя меры, і фашысцкіх шпіёнаў ў Тэгеране хутка абясшкодзілі. «Вялікая тройка» была выратавана...

Аднак вось што бянтэжыць ва ўсёй гэтай эпапеі. Няма ніводнага дакументальнага пацвярджэння аперацыі «Доўгі скачок». Яе дэталі чамусьці да гэтага часу не дала ніводная са спецслужбаў, якія, па ідэі, павінны быць датычнымі да гэтых падзей — ні Служба знешняй разведкі, ні Галоўнае разведвальнае ўпраўленне Генеральнага штаба, ні якая-небудзь іншая служба бяспекі. Можа, на аперацыю да гэтага часу накладзены грыф сакрэтнасці?

Але як бы там ні было, Мікалай Сідаравіч Уласік са сваімі падначаленымі не тое што нямецкіх шпіёнаў не дапусціў на ахоўную тэрыторыю — муха лішняя не праляцела.

СКОНЧЫЛАСЯ вайна. Служба працягвалася. Рашэннем ЦК у 1947 годзе былі выдзелены сродкі на будаўніцтва і рэканструкцыю дзяржаўных дач у Крыме, Сочы, Гаграх, Сухумі, Цхалтуба, Баржомі, на возеры Рыца і ў Падмаскоўі. І зноў усё гэта даручылі М.С. Уласіку. Заўважым: чалавеку з трохкласнай адукацыяй. Але Галоўнае ўпраўленне мела сваіх фінансістаў, бухгалтароў, будаўнічых спецыялістаў. Так што сам Уласік з яго трыма класамі і не спрабаваў ва ўсім гэтым разбірацца. Ды і не тут чакала яго бяда. Як вядома, падпарадкоўваўся ён кіраўніцтву НКДБ (затым — МДБ), а значыць, сумна вядомым Берыі, Мяркулову, Кабулаву, Цанаве, Сярову, Гаглідзэ.

Але Уласік быў бліжэй, чым кожны з іх, да Сталіна, і правадыр часам раіўся з ім, у тым ліку і па справах Міністэрства дзяржбяспекі. Пра гэта было вядома ў асяроддзі Берыі. І не магло не выклікаць раздражнення, тым больш што Уласік часцяком негатыўна адзываўся пра сваіх начальнікаў. У 1948 годзе быў арыштаваны камендант «Бліжняй дачы» Федасееў. Следства вялося пад кіраўніцтвам Сярова. Пад катаваннямі Федасееў даў паказанні пра тое, што Уласік хацеў атруціць Сталіна.

Потым паўстала «справа ўрачоў». З'явіліся паказанні пра тое, што разам з урачамі Уласік зноў жа выношваў забойства Сталіна. У маі 1952-га нечакана пачалася глыбокая праверка фінансава-гаспадарчай дзейнасці ўпраўлення аховы. У камісію, акрамя спецыялістаў, увайшлі Берыя, Булганін, Паскробышаў. Усё выпітае, з'едзенае і растранжыранае «павесілі» на Уласіка і яго намесніка Лынько. Далажылі Сталіну. Лынько арыштавалі, а Уласіка адправілі на Урал, у горад Азбест, на пасаду намесніка начальніка Бажэнаўскага папраўча-працоўнага лагера МУС СССР.

У працоўным кабінеце. 1940

Пазней генерал успамінаў у сваіх дзённіках, што «папахі паляцелі» з галоў вельмі многіх яго падначаленых. На працягу паўгода — да снежня 1952-га — ён працаваў у Азбесце і «бамбаваў» Сталіна лістамі, у якіх кляўся ў сваёй невінаватасці і адданасці. А 16 снежня яго выклікалі ў Маскву і арыштавалі па «справе ўрачоў», абвінаваціўшы ў тым, што пакрываў «варожыя дзеянні» прафесараў Ягорава, Ваўсі і Вінаградава. Як вядома, «справа ўрачоў» была спынена пасля смерці Сталіна і арыштаваныя выпушчаныя на свабоду — усе, акрамя Уласіка.

БОЛЬШ за сто разоў яго дапытвалі за час следства. Яго абвінавачвалі ў шпіянажы і падрыхтоўцы тэрактаў, антысавецкай агітацыі і разбэшчаных паводзінах у быце. Прычым па кожным з абвінавачванняў яму пагражаў немалы тэрмін. «Прэсавалі» 56-гадовага Мікалая Сідаравіча ў Лефортаве з веданнем справы — трымалі ў кайданках, у камеры круглыя суткі гарэла яркая лямпачка, спаць не давалі, выклікаючы на допыты сярод ночы, ды яшчэ за сцяной пастаянна круцілі пласцінку з дзіцячым плачам. Ладзілі нават імітацыю расстрэлу (пра гэта Уласік піша ў сваім дзённіку). Але трымаўся ён малайцом, не траціў пачуцця гумару. Ва ўсякім выпадку, у адным з пратаколаў ён дае такія «прызнальныя» паказанні: «Я сапраўды жыў сумесна з многімі жанчынамі, распіваў спіртное з імі, але ўсё гэта адбывалася за кошт майго асабістага здароўя і ў вольны ад службы час».

Яго працягваюць трымаць у Лефортаве. І ўжо ставяць у віну сувязь з мастаком-канструктывістам Стэнбергам, які нібыта займаўся шпіянажам, афармляючы святочныя плакаты на Краснай плошчы...

Карацей, і пры Сярове Мікалая Сідаравіча Уласіка трымалі пад замком. Цягалі праз дзень, і ў асноўным па начах, на допыты. Контррэвалюцыйныя, г. зн. палітычныя, злачынствы адпалі самі сабой, крадзяжы «з панскага стала» — таксама. Адпаў і такі эпізод. Пасля Патсдамскай канферэнцыі ў 1945 годзе Уласік сярод іншага трафейнага барахла, выдадзенага яму ў падарунак ад Чырвонай Арміі, вывез з Германіі ў эшалоне НКВД каня, дзвюх кароў і аднаго быка. І даставіў усю гэтую жыўнасць у Беларусь сваёй сястры Вользе. Пасля яго арышту ў 1952 годзе сталі разбірацца і з гэтым. Высветлілі, што ў 1941-м яго родную вёску Бабінічы Баранавіцкай вобласці захапілі немцы. Дом, у якім жыла сястра, спалілі, палову жыхароў вёскі расстралялі, старэйшую дачку сястры сагналі на работы ў Нямеччыну (адтуль яна так і не вярнулася), карову і каня забралі. Вольга з мужам Пятром і дваімі дзецьмі сышла да партызанаў, а пасля, калі пагналі немцаў, вярнулася ў разрабаваную вёску. Вось Уласік і даставіў з Германіі сястры як бы частку яе ж дабра. Пра гэта даклалі Сталіну, і той, паглядзеўшы на першага намесніка начальніка Упраўлення па праверцы партыйных кадраў ЦК ВКП(б) Сямёна Ігнацьева, які дакладваў яму, сказаў: «Ты што, ах..., ці што?!».

Пра гэта ўспамінаў у канцы жыцця сам Уласік. Ужо не ведаем, так было на самай справе ці не, але калі так, то трэба аддаць належнае правадыру: ён меў рацыю. Між іншым, Патсдам — гэта рэзідэнцыя прускіх каралёў. Германіі вельмі пашанцавала, што Уласік, выязджаючы круцілі пласцінку з дзіцячым плачам. Ладзілі нават імітацыю расстрэлу (пра гэта Уласік піша ў сваім дзённіку). Але трымаўся ён малайцом, не траціў пачуцця гумару. Ва ўсякім выпадку, у адным з пратаколаў ён дае такія «прызнальныя» паказанні: «Я сапраўды жыў сумесна з многімі жанчынамі, распіваў спіртное з імі, але ўсё гэта адбывалася за кошт майго асабістага здароўя і ў вольны ад службы час».

Яго працягваюць трымаць у Лефортаве. І ўжо ставяць у віну сувязь з мастаком-канструктывістам Стэнбергам, які нібыта займаўся шпіянажам, афармляючы святочныя плакаты на Краснай плошчы...

Карацей, і пры Сярове Мікалая Сідаравіча Уласіка трымалі пад замком. Цягалі праз дзень, і ў асноўным па начах, на допыты. Контррэвалюцыйныя, г. зн. палітычныя, злачынствы адпалі самі сабой, крадзяжы «з панскага стала» — таксама. Адпаў і такі эпізод. Пасля Патсдамскай канферэнцыі ў 1945 годзе Уласік сярод іншага трафейнага барахла, выдадзенага яму ў падарунак ад Чырвонай Арміі, вывез з Германіі ў эшалоне НКВД каня, дзвюх кароў і аднаго быка. І даставіў усю гэтую жыўнасць у Беларусь сваёй сястры Вользе. Пасля яго арышту ў 1952 годзе сталі разбірацца і з гэтым. Высветлілі, што ў 1941-м яго родную вёску Бабінічы Баранавіцкай вобласці захапілі немцы. Дом, у якім жыла сястра, спалілі, палову жыхароў вёскі расстралялі, старэйшую дачку сястры сагналі на работы ў Нямеччыну (адтуль яна так і не вярнулася), карову і каня забралі. Вольга з мужам Пятром і дваімі дзецьмі сышла да партызанаў, а пасля, калі пагналі немцаў, вярнулася ў разрабаваную вёску. Вось Уласік і даставіў з Германіі сястры як бы частку яе ж дабра. Пра гэта даклалі Сталіну, і той, паглядзеўшы на першага намесніка начальніка Упраўлення па праверцы партыйных кадраў ЦК ВКП(б) Сямёна Ігнацьева, які дакладваў яму, сказаў: «Ты што, ах..., ці што?!».

Пра гэта ўспамінаў у канцы жыцця сам Уласік. Ужо не ведаем, так было на самай справе ці не, але калі так, то трэба аддаць належнае правадыру: ён меў рацыю. Між іншым, Патсдам — гэта рэзідэнцыя прускіх каралёў. Германіі вельмі пашанцавала, што Уласік, выязджаючы

адтуль, задаволіў толькі сваю «жывёлагадоўчую» цікавасць, а не захапіўся, скажам, працамі Рэмбранта.

З прысуду: «... Уласік, з'яўляючыся начальнікам Галоўнага ўпраўлення аховы МДБ СССР, карыстаючыся асаблівым даверам Савецкага Урада і ЦК КПСС, злоўжываў аказаным яму даверам і сваім высокім службовым становішчам...». І далей ідуць абвінавачванні: «1. Маральна апусціўся, сістэматычна п'янстваваў, страціў пачуццё палітычнай пільнасці, праяўляў неразборлівасць у бытавых сувязях. 2. П'янствуючы разам з нейкім Стэнбергам, зблізіўся з ім і выдаў яму і іншым асобам сакрэтныя звесткі. З кватэры Стэнберга вёў размовы па тэлефоне з кіраўніком Савецкага Урада т. Сталіным, а таксама службовыя размовы са сваімі падначалены. 3. Расшыфраваў перад Стэнбергам трох сакрэтных супрацоўнікаў. 4. Маючы зносіны з асобамі, якія «не выклікаюць палітычнага даверу», падтрымліваў сувязь з замежнікамі, Уласік выдаваў ім пропускі на трыбуны Краснай плошчы. 5. Захоўваў у сваёй кватэры службовыя дакументы, у прыватнасці, план Патсдама і нанесеную на яго сістэму аховы ўсяго раёна Патсдамскай канферэнцыі (1945), а таксама дакладную запіску аб рабоце Сочынскага аддзела МУС у асаблівы перыяд 1946 года, расклад руху урадавых цягнікоў і іншыя дакументы».

На гэтым абвінавачванне скончылася. А следства ішло два з гакам гады! А вось фрагмент крымінальнай справы Уласіка, дакладней, з пратакола судовага пасяджэння ад 17 студзеня 1955 года:

> *«**Пытанне суда:** Што збліжала вас і мастака Стэнберга? **Уласік:** Вядома, збліжэнне было на глебе сумесных выпівак і знаёмстваў з жанчынамі.*
> ***Пытанне суда**: Для гэтага ў яго была зручная кватэра? **Уласік:** У яго я бываў вельмі рэдка.*
> ***Пытанне суда:** Вы выдавалі пропускі на Красную плошчу нейкай Нікалаевай, якая была звязана з замежнымі журналістамі? **Уласік:** Я толькі цяпер усвядоміў, што здзейсніў гэтым злачынства.*
> ***Пытанне суда:** Сваёй сужыцельцы Грыдусавай і яе мужу Шрагеру вы давалі квіткі на трыбуны стадыёна «Дынама»? **Уласік:** Даваў.*
> ***Пытанне суда:** Вы захоўвалі ў сябе на кватэры сакрэтныя дакументы? **Уласік:** Я збіраўся скласці альбом, у якім фотаздымкамі і дакументамі было б адлюстравана жыццё і дзейнасць тав. І.В. Сталіна.*
> ***Пытанне суда:** Якім шляхам вамі набыты радыёла і прыёмнік? **Уласік:** Іх мне даслаў у падарунак Васіль Сталін. Але я іх затым аддаў на дачу «Бліжняя».*
> ***Пытанне суда:** Што вы можаце сказаць пра чатырнацаць фотаапаратаў і аб'ектывы да іх, якія былі ў вас? **Уласік:** Большасць з іх я атрымаў па сваёй службовай дзейнасці. Адзін цэйсаўскі апарат я купіў праз Знешгандаль, яшчэ адзін апарат мне падарыў таварыш Сяроў...»*

Цікавая доказная частка прысуду. Яна проста ўнікальная. «Вінаватасць Уласіка ў здзяйсненні названых злачынстваў даказаная паказаннямі дапытаных у судзе сведак, матэрыяламі папярэдняга следства, рэчавымі доказамі, а таксама частковым прызнаннем сваёй віны Уласіка». І ўсё. Прысуд — дзесяць гадоў высылкі. Па амністыі ад 27 сакавіка 1953 года гэты тэрмін скарочаны напалову — да пяці гадоў. Пра гэта сказана тут жа, у прысудзе. А тое, што Уласік два з лішнім гады адседзеў у Лефортаве? Гэта не лічыцца? І калі гэта лічыцца, то як? У прысудзе пра гэта — ні слова. Да 17 мая 1956 года ён чамусьці знаходзіцца пад вартай, а гэта яшчэ год і чатыры месяцы. Праўда, ужо ў «аддаленай мясцовасці СССР» — у Краснаярску. Адкуль у маі 1955-га адправіў ліст на імя Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К.Я. Варашылава:

«Кіраўнік урада І.В. Сталін, знаходзячыся на поўдні пасля вайны, у маёй прысутнасці выказваў вялікае абурэнне супраць Берыі, кажучы пра тое, што органы дзяржаўнай бяспекі не апраўдалі сваёй працай належнага забеспячэння. Сказаў, што даў указанне адхіліць Берыю ад кіраўніцтва МДБ. Пытаўся ў мяне, як працуюць Мяркулаў, Кабулаў, Гаглідзэ. Я расказаў яму, што ведаў.

І вось я потым пераканаўся, што гэтая гутарка паміж мной і кіраўніком урада стала ім дакладна вядомай. Я быў уражаны гэтым. Я зразумеў, што, акрамя смерці, мне больш чакаць не было чаго, гэта значыць, я яшчэ раз пераканаўся, што яны падманулі кіраўніка ўрада... Яны запатрабавалі паказанняў на шматгадовага памочніка Сталіна Паскробышава. Я адмовіўся, заявіўшы, што ў мяне ніякіх дадзеных кампраментацыі на Паскробышава няма. За адмову ад паказанняў на Паскробышава мне сказалі — здохнеш у турме...».

Ёсць адзін цікавы момант, пра які ведаў М.С. Уласік і пра які расказвала ў 1989 годзе ўнучка І.В. Сталіна Надзея:

> *«У 1952 годзе ў сувязі з арыштам М.С. Уласіка і А.М. Паскробышава ў нас была цалкам зменена абслуга, акрамя няні Святланы Іосіфаўны. Так ужо атрымалася, што мая выхавальніца перамясцілася да ўнучкі Л.П. Берыі. Дык вось, пасля пры сустрэчы са мной яна расказвала, што ў доме ў Л.П. Берыі ведалі ўсе размовы майго дзеда, якія ён вёў нават з кім-небудзь сам-насам, на дачы ці ў Крамлі. А 28 лютага 1953 года яе выхавальніца сказала, што І.В. Сталін «здохне ў найбліжэйшыя дні», а Л.П. Берыя стане кіраўніком савецкай дзяржавы замест яго»...*

УПАРАДКУ памілавання (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 15 мая 1956 года падпісаў Клім Варашылаў) Уласік вызвалены з-пад варты і ад далейшага адбыцця пакарання. Вярнуўшыся ў Маскву, ён просіцца на прыём да Генеральнага пракурора Рудэнкі — той яго не прыняў. Накіроўвае прашэнне аб рэабілітацыі ў Камісію партыйнага кантролю (КПК) М. Шверніку, потым А. Пельшэ — зноў адмова. Не дапамагла і падтрымка маршалаў Г. Жукава і А. Васілеўскага. Яго кватэру на вуліцы Горкага (у доме, дзе зараз знаходзіцца Канцэртная зала імя Чайкоўскага) ператварылі ў камуналку. Усю маёмасць вывезлі яшчэ ў ходзе следства.

18 чэрвеня 1967 года Мікалай Сідаравіч Уласік памёр ад раку лёгкіх, так нічога і не дабіўшыся. На паўторны зварот яго дачкі аб пасмяротнай рэабілітацыі бацькі ў 1985 годзе Галоўны ваенны пракурор А. Горны адказаў адмовай. Сёння справядлівасць быццам бы адноўленая, але зноў праблемы. Дачцэ Уласіка Надзеі Мікалаеўне каля года патокам ішлі званкі і лісты-тлумачэнні з Камісіі па рэабілітацыі і з ФСБ аб тым, што яе бацька асуджаны не паводле арт. 58 КК РСФСР (дзяржаўнае злачынства), а па арт. 193-17 КК РСФСР (простае вайсковае злачынства), з прычыны гэтага ахвярай палітычных рэпрэсій М.С. Уласік нібыта не з'яўляецца, гэтак жа як і яго дачка не з'яўляецца пацярпелай.

Што сказаць на ўсё гэта? Артыкул трэці Закона «Аб рэабілітацыі» ад 18 кастрычніка 1991 года абвяшчае: «Падлягаюць рэабілітацыі асобы, якія па палітычных матывах былі: а) асуджаныя за дзяржаўныя і іншыя злачынствы». М.С. Уласіка асудзілі за «іншыя» злачынствы. Па матывах палітычных ці непалітычных? Думаецца, двух думак тут быць не можа. Мікалай Сідаровіч Уласік не расстрэльваў і не падпісваў расстрэльных спісаў, у «двойках», «тройках», «асаблівых нарадах» не ўдзельнічаў, служыў добрасумленна, як мог і ўмеў, пакуль не трапіў паміж молатам і кавадлам.

Яшчэ трэба дадаць у канцы, што незадоўга да смерці Мікалай Сідаравіч перадаў свой фотаархіў у музей, і трэба прама сказаць, што, дзякуючы гэтаму мы сёння можам мець уяўленне пра многія моманты, звязаныя з жыццём І.В. Сталіна, яго сям'і, блізкага акружэння і наогул — аб тым складаным, з мноства «белых» і «чорных» плям, перыядзе ў нашай гісторыі.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ. *slaneuski@zviazda.by*

Па словах Мікалая Уласіка, генералісімус цаніў тонкі анекдот.

Сталін аднойчы наведаў МХАТ, расказаў аб «бягучым моманце», пагутарыў з паважанымі акцёрамі. Пасля пытаецца ў старэйшай супрацоўніцы тэатра Яблачкінай:

— Як вы сабе ўяўляеце: што такое камунізм?

— О, камунізм!.. Камунізм — гэта будзе такі цудоўны час, калі ўсяго будзе хапаць, на любы выбар і густ, без усялякіх чэргаў. Словам, як пры царызме...

■ Сваімі рукамі

ВЫХАВАННЕ ПРЫГАЖОСЦЮ

У Ашмянскую школу прыязджаюць на фотасесію нават з іншых раёнаў

Незвычайна, але факт: вясельныя картэжы, каб сфатаграфавацца, ужо неаднойчы спыняліся ў Ашмянах каля сярэдняй школы № 1. І не толькі мясцовыя жыхары, але нават і госці з суседніх раёнаў. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў дырэктар школы, заслужаны настаўнік Беларусі Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ.

Чым жа так прывабліве, здавалася б, звычайная прышкольная тэрыторыя? Гэта цяжка перадаць словамі — трэба бачыць. Дзівосны прыродны куток, які шмат гадоў таму стаў стварацца па ініцыятыве Міхаіла Мар'янавіча. Пачыналі з некалькіх кветкавых клумбаў, а цяпер тут ужо сапраўдны парк, упрыгожаны шматлікімі відамі раслін і рознымі архітэктурнымі формамі. Усё сваімі рукамі — настаўнікаў і вучняў. Для сябе і ўсіх, каму такое харастро не толькі даспадобы, але і дае прыклад для пераймання.

— Не цікава, калі нічога ля школы не змяняецца. Тым больш што задум і фантазіі ў нас хапае. Два гады таму, напрыклад, з'явіўся вось гэты «замак», сёлета — новыя кветачніцы з каменю. А крыху раней — адзін, потым другі фантан, — зазначае Міхаіл Гружэўскі.

Фантаны, паколькі ваду трэба эканоміць, працуюць не пастаянна, а ў асноўным падчас школьных свят. Акрамя таго, зрабілі замкнуты цыкл водазабеспячэння паркавай тэрыторыі: помпа гоніць ваду ўгору, а адтуль яна ідзе самацёкам.

Зразумела, што клопатаў паркавая гаспадарка, а таксама школьны стадыён патрабуюць шмат, асабліва летам, калі трава расце як на дражджах. Для гэтага дзеці штодзённа па графіку прыходзяць сюды на працоўную практыку.

Мясцовыя жыхары, паколькі ў мікрараёне Заходні такой зоны адпачынку пакуль няма, амаль штодзённа карыстаюцца паслугамі школы. У парку адпачываюць мамы з каляскамі, на стадыёне гуляюць не толькі выхаванцы гэтай навучальнай установы, а ўсе ахвотныя. Уваход вольны, брамка зачыняецца толькі на ноч. Вядома, вартаўнік сочыць за парадкам, аднак нічога дрэннага ніколі не здаралася. Пэўна, прыгажосць, якая тут стала ўжо нормай, выхоўвае не толькі школьны калектыў.

Пачыналі з некалькіх кветкавых клумбаў, а цяпер тут сапраўдны парк. Усё зрабілі сваімі рукамі — настаўнікаў і вучняў. Для сябе і ўсіх, каму такое харастро не толькі даспадобы, але і дае прыклад для пераймання.

— Складаем графік водпускаў так, каб на стадыёне пастаянна быў наш настаўнік — прыглядваў за дзецьмі, выдаваў мячы, нешта арганізоўваў, — кажа Міхаіл Гружэўскі.

Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ з сёлетнімі выпускнікамі школы.

Дарэчы, у школе можна павучыцца не толькі ўзорнаму парадку, што неаднойчы адзначалася на абласных і рэспубліканскіх конкурсах, але і ўменню зарабляць грошы. Сёлетняе заданне (220 мільёнаў рублёў) ужо перавыканалі — дзякуючы платным адукацыйным паслугам, здачы металалому і макулатуры, а таксама канцэртам. У школе тры ўзорныя калектывы — фальклорны тэатр песні і танцу «Званочкі», эстрадная студыя «Палёт» і тэатр танца «Эфект». Яны ладзяць шмат канцэртаў, асабліва ў перыяд калядных свят — у зале заўсёды аншлаг. Акрамя таго, залу (сёлета райвыканкам дапамог абнавіць апаратуру) арандуюць іншыя арганізацыі і прадпрыемствы. Гэта таксама папаўняе школьны бюджэт.

Дзеля агульных інтарэсаў працуе і... школьная кабыла. Калі камусьці спатрэбіцца, то Машка (вядома ж, за пэўную плату) дапаможа на прысядзібным участку. А зімой яе запрагаюць у сані, каб пакатаць дзяцей па стадыёне. Ахвотнікаў нямала, бо цана новых уражанняў сімвалічная.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*
г. Ашмяны


Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.

АСЦЯРОЖНА: ДЗЕЦІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абмяжуйце і вольны доступ да лекаў, якія захоўваюцца дома. Рознакаляровыя прыгожыя таблеткі і ёмістасці, у якіх яны захоўваюцца, так і цягнуць да сябе дзіцячыя вочы. Нядаўна ў Малдове дзяўчынка праглынула лекі для прафілактыкі венозных трамбозаў і нейкія псіхатропныя прэпараты, якія прымала яе бабуля. Здарылася гэта літаральна за адно імгненне, калі старая адвярнулася. У бальніцу дзяўчынку даставілі ў цяжкім стане — моцна парушылася маўленне і рухальная актыўнасць... А яшчэ здараюцца выпадкі, калі старыя людзі незнарок блытаюць паміж сабой лекі з-за падобных па колеры і форме ўпаковак. І замест звычайных таблетак супраць кашлю даюць малому, напрыклад, моцны седатыўны сродак. Канчаецца гэта ў лепшым выпадку шпіталізацыяй.

Замяніўшы разраджаную батарэйку, не адкладвайце яе на стол, а выносьце адразу ж у спецыяльны кантэйнер. Асабліва небяспечныя для дзяцей так званыя «кнопкавыя» элементы сілкавання, якія ўжываюцца ў разнастайных цацках, з-за сваіх мініяцюрных памераў. Як канстатуюць медыкі, у апошнія гады дзеці батарэйкі глытаюць часцей. Пасля таго, як такі «сюрпрыз» захрас у страваводзе, праз пару гадзін слізістая абалонка атрымлівае моцны хімічны апёк ад электраліту, які пачынае выцякаць з батарэйкі. Але калі батарэйку на гэтым этапе не дастануць урачы, то разбуральны працэс працягвае ісці далей. Таму лепш устрымацца ад куплі такой цацкі, калі ў ёй няма магчымасці надзейна ізаляваць ад маленькага эксперыментатара адсек з батарэйкамі. «Пальчыкавай» ці «мезенчыкавай» батарэйкай дзіця проста можа падавіцца, як адбылося два гады таму ў Гродзенскай вобласці.

ЧЫМ КАРЫСНЫ РАДЫУС БЯСПЕКІ?

— Пліты і вокны таксама прыцягваюць увагу дзяцей, — працягвае Віталь Навіцкі. — Таму не падпускайце на кухню малога, калі на пліце стаіць ёмістасць з гарачай вадой ці кіпенем. А на аконных рамах лепш паздымайце ручкі, асабліва калі вы ўсталявалі маскітныя сеткі на цёплы перыяд. Будзе крыху нязручна адчыняць і зачыняць форткі, але затое ж ваша дзіця будзе ў бяспецы. Калі ж вы адчынілі фортку самі, будзьце пільнымі. Дастаткова прыгадаць нядаўні выпадак у Мінску, калі шасцігадовы хлопчык гуляў каля акна і абаперся на сетку. Вагі малога яна не вытрымала, і дзіця звалілася ўніз з трэцяга паверха. У бальніцы яно скончыла...

Проста перадаць улетку маленькага чалавечка пад апеку бабе і дзеду нельга. Спярша трэба стварыць так званы «радыус бяспекі». Ахоп яго залежыць ад узросту дзіцяці. Напрыклад, калі вашаму малому сем гадоў, то радыус бяспекі мусіць быць прыкладна кіламетровы. І чым дзіця большае, тым гэтая велічыня павінна павялічвацца. Стапрацэнтнай гарантыі радыус, вядома, не дасць, аднак многія патэнцыйныя пагрозы папярэдзіць можа. Асноўныя крыніцы небяспекі ў доме мы ўжо прааналізавалі вышэй. За межамі дома трэба вельмі ўважліва праінспектаваць тэрыторыю і выявіць усе патэнцыяльна небяспечныя месцы. Гэта можа быць якісьці вадаём, лясны масіў, будоўля, праезная частка, бярвенне, якое складзена ў штабелі. У гарадскім двары гэта ўсе гульнявыя канструкцыі кшталту арэляў і каруселяў. Не лянуйцеся праверыць іх асабіста на трываласць: абследаванне зойме максімум паўгадзіны. І пасля гэтага трэба правесці поўны інструктаж з дзіцем. Пры гэтым звярніце ўвагу на спецыфіку дзіцячай псіхалогіі. Чым узрост меншы, тым большую ўвагу трэба засяроджваць на момантах кшталту «не рабі, не хадзі, не чапай». Аднак са сталеннем дзіцяці трэба ўжо болей расказваць, чаму нельга рабіць пэўныя дзеянні, і прапаноўваць бяспечную альтэрнатыву.

Ратаўнікі не раяць пакідаць малога пад наглядам старэйшых дзяцей. Шанцы на тое, што яны загуляюцца і на некаторы час страцяць кантроль над малым, высокія. А адыграць сітуацыю назад, як у камп'ютарнай гульні, будзе ўжо немагчыма. Здараецца і так, што бацькі пакінулі малога дома аднаго раз, другі, а калі нічога не адбылося, то робяць выснову, што і надалей нічога не здарыцца. Але гэта насамрэч не так.

ДАЙЦЕ ЧАС НА АДАПТАЦЫЮ

Перамена гарадской абстаноўкі на вясковую больш за ўсіх небяспечная датычна паводзін на дарозе. Дзіця, якое праводзіць пераважную частку года ў гарадскіх умовах, паступова прывыкае да таго, што на вуліцах шмат аўтамабіляў, а ў дварах яны перасоўваюцца з невялікай хуткасцю, якая абмежавана Правіламі дарожнага руху да 20 км у гадзіну. А ў вёсцы часам няма ні святлафораў, ні спецыялізаваных пешаходных пераходаў. Машыны ездзяць рэдка. Гэта і падкупляе маленькага пешахода, але... З-за таго, што дарогі вольныя, аўтамабілі ездзяць значна хутчэй. І калі ў гарадскім двары кіроўца яшчэ мае шанцы паспяхова ўдарыць па тармазах, то на вясковай вуліцы яны ўжо змяншаюцца.

Неўзабаве дзеці пачнуць вяртацца з вёсак у горад, каб падрыхтавацца да новага навучальнага года. Таму некалькі дзён лепш не адпускаць малых адных на вуліцу. За гэты перыяд яны якраз адаптуюцца да ранейшых умоў — запаркаваных аўтамабілямі дваро ў і інтэнсіўнага руху па вуліцах...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

■ З чыстага ліста

АД ВАЙНЫ ЗБЕГЛІ

Цяпер уцекачам трэба адаптавацца жыць у краіне з адрознай культурай

Некалькі месяцаў таму з Сірыі ў Гомель прыбылі тры сям'і, якія сёння чакаюць прысваення статусу бежанца. Дарэчы, па праграме ААН ім былі прадастаўлены новыя кватэры з мэбляй і неабходнай бытавой тэхнікай.

Сям'я Імада Ахмада.

Між іншым, тры сям'і — гэта 14 чалавек. Хутка іх колькасць павялічыцца, бо Саза Ахмад літаральна праз месяц стане матуляй пяты раз. Яе муж Імад нядаўна працаўладкаваўся ў адзін з гомельскіх рэстаранаў. Стравы, якія ён гатуе, карыстаюцца папулярнасцю ў наведвальнікаў. Сярэдняя дачка Сазы і Імада падышла да мяне знаёміцца, назвала сваё імя: Зейна. Кемлівая дзяўчынка паўтарае словы на чужой для яе мове і, глядзіш, неўзабаве хутка будзе сама вучыць бацькоў.

Дарэчы, адаптацыя для грамадзян краіны зусім іншай культуры адбываецца дастаткова складана. Крыху размаўляць за гэты час навучыліся толькі мужчыны. Дарэчы, адзін з іх мову ведае лепш за іншых. Хасан Шыбат заканчваў Харкаўскі медыцынскі ўніверсітэт і таму цяпер для ўсіх з'яўляецца перакладчыкам. Спадзяецца, што хутка атрымаецца пацвердзіць свой дыплом і пачаць працаваць па спецыяльнасці.

Канфлікт у Сірыі доўжыцца ўжо пяць гадоў. Узброеныя сутыкненні прывялі да таго, што больш за тры мільёны чалавек сталі бежанцамі. Амаль 100 з іх знаходзяцца ў Беларусі. Як і іншыя, Мухамед Чыку вывез сям'ю далей ад вайны. У родным Кабане радыкальныя ісламісты спалілі яго краму і збіраліся расправіцца з жонкай і дзецьмі. Потым былі ўцёкі ў ліванскі офіс ААН, а ўжо адтуль іх адправілі ў Беларусь. Усе ў адзін голас кажуць, што ў нашай краіне ім вельмі падабаецца: чыста, спакойна, вельмі добразычлівыя людзі.

Бежанцаў у Беларусі пад свой кантроль узялі супрацоўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў: разам з прадстаўнікамі ААН яны займаюцца адаптацыяй замежнікаў. Не ўсё адбываецца хутка і проста, як бы хацелася. Магчыма, не супадаюць чаканні і рэчаіснасць. Да таго ж замежнікі добра ведаюць пра тыя «тлустыя» дапамогі, якія атрымліваюць іх суайчыннікі ў аналагічных сітуацыях у некаторых краінах Заходняй Еўропы. І чамусьці ўпэўнены, што так павінна быць і ў Беларусі. У нашай краіне, напрыклад, частка тых дапамог, якія прадастаўляюцца бежанцам, потым ідзе на аплату іх жылля.

Начальнік упраўлення па грамадзянстве і міграцыі УУС Гомельскага аблвыканкама Ірына Кобрусева гаворыць, што наш бок імкнецца стварыць камфортныя ўмовы для пражывання грамадзян Сірыі:

— На заканадаўчым узроўні ёсць магчымасці, каб аказаць дапамогу гэтым сем'ям. Неабходна толькі жаданне саміх грамадзян як мага хутчэй інтэгравацца ў наша грамадства, вучыць мову, пайсці працаваць і зарабляць сродкі на сваё жыццё.

Прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Жан Іў Бушардзі нядаўна пабываў з афіцыйным візітам у Гомельскай вобласці. Ён адзначыў, што прадстаўніцтва хадайнічае пра павелічэнне бюджэту для аплаты выдаткаў на арэнду жылля, медыцынскіх і іншых паслуг для вымушаных перасяленцаў. Дарэчы, размова ішла не толькі пра сірыйцаў, але і пра грамадзян Украіны. Ён адзначыў, што арганізацыя і надалей працягне цеснае супрацоўніцтва з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа, Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі і іншымі партнёрамі.

Разам з дыпламатам у Гомельскай вобласці пабывала сірыйскі фундатар, член Мінскага міжнароднага клуба жонак паслоў і дыпламатаў Эўлін Абейд Юсэф. Яна адзначыла, што неабходна вывучыць патрэбы выхадцаў з Сірыі, каб наладзіць цесны кантакт з імі і аказваць дапамогу на пастаяннай аснове.

Таксама праведзены перамовы з кіраўніцтвам гомельскага прадпрыемства ААТ «Сейсматэхніка» па пытаннях працаўладкавання вымушаных мігрантаў з Украіны. Паток апошніх, між тым, не прыпыняецца. Цяпер на Гомельшчыне налічваецца звыш 8 тысяч былых жыхароў Украіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.
astashkevich@zviazda.by

ПААЗЕРСКІЯ АЛЕНІ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

—У сакавіку 2014 года мы набылі больш за сто самак і шэсць самцоў найлепшых еўрапейскіх ліній гэтага віду. З таго часу нарадзілася больш за сто сорак аленянят, — распавядае Раман Антушэвіч. — А сёлета атрымалі новае — ужо з беларускай радаслоўнай — пакаленне высакакласных аленяў.

Дзіўна, як жывёлы рэагуюць на з'яўленне егера. Пачуўшы гук яго машыны, алені ўважліва ўглядаюцца ў бок дарогі і, як толькі Раман спыняецца каля варот вальера, рухаюцца да загародкі з кармушкамі, бо ведаюць, што ў гэты час ім будзе сытны і смачны ласунак. Паперадзе заўсёды бягуць маладыя самцы, іх Раман выгадаваў, бо ад іх, маленькіх, адракліся маці, не давалі малака. Егер гадаваў аленянят дома, і цяпер яны давяраюць яму як нікому і заўсёды радасна сустракаюць.

Цяпер у паляўнічай гаспадарцы поўным ходам ідзе нарыхтоўка кармоў (сенажу, сена) на будучы халодны сезон. Праводзіцца кантрольнае ўзважванне пагалоў'я, вядзецца апрацоўка жывёл ад інфекцый. І ў той жа час дабудоўваецца плошча новага вальера для палявання, у якім будуць паляваць, як у старажытныя часы — з лукам і стрэламі.

Асобнай ад развядзення аленяў і штодзённых абавязкаў егера тэмай стаіць дачыненне Рамана Антушэвіча да вытворчасці беларускіх усюдыходаў. Былому калгаснаму ветурачу, калі ён пачаў працаваць у паляўнічай гаспадарцы «Абстэрна», даверылі выпрабоўваць новую мадэль снегабалотахода беларускай вытворчасці. Шэсць гадоў таму ён у якасці кіроўцы вывучаў машыну, правяраў яе на выносівасць у самых розных умовах, асабліва на балотах, на бездарожжы, снезе і вадзе. І ў тым, што беларускі усюдыход «БМЕ-1015» пастаўлены на канвеер і служыць людзям, дапамагаючы ім перамяшчацца ў цяжкадаступных месцах, ёсць і заслуга аленявода Рамана Антушэвіча.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
anatol@zviazda.by
Мёрскі раён.

Яшчэ больш фота на сайце zviazda.by

■ Сітуацыя

БЕЗ ПРАВА НА ПАЎТОРНАЕ ПАРУШЭННЕ

Гандлёвай сетцы «Дабраном» дазволілі дзейнічаць і пасля 21 ліпеня

Аб гэтым паведамляе Мінгандлю, якое раней збіралася зачыніць на 90 дзён 177 крам гэтай рознічнага сеткі за вялікія даўгі перад пастаўшчыкамі.

Падставай для адмены рашэння сталі вынікі кантрольнай праверкі, падчас якой кіраўніцтва ЗАТ «Дабраном» прад'явіла дакументы, што пацвярджаюць пагашэнне пратэрмінаванай запазычанасці на суму больш за 30 млрд рублёў, якая была перад пастаўшчыкамі на момант вынясення прадпісання аб прыпыненні працы магазінаў сеткі, адзначылі ў Мінгандлю.

Акрамя таго, у перыяд правядзення кантрольнай праверкі з 15 ліпеня рытэйлер «Дабраном» пералічыў у рамках пагашэння бягучай і новай пратэрмінаванай запазычанасці за тавары больш як 60 млрд рублёў. Больш за тое, цяпер гэтая гандлёвая сетка папярэджана аб тым, што ў выпадку паўторнага факта выяўлення парушэнняў, што паслужылі падставай для прыпынення працы іх аб'ектаў, Мінгандлем у адпаведнасці з нормамі Указа № 567 можа быць вынесена рашэнне аб поўнай забароне іх дзейнасці.

«Паводле інфармацыі кіраўніцтва названага таварыства, уся пратэрмінаваная запазычанасць пагашана выключна за кошт атрыманай выручкі. Такім чынам, для пагашэння пратэрмінаваных (да 6 месяцаў) даўгоў ЗАТ «Дабраном» спатрэбілася менш за два тыдні», — паведамляецца на сайце Мінгандлю.

Дарэчы, сетка «Дабраном» у сакавіку ўзяла ў кіраванне даволі буйнога рытэйлера «Родная старонка». А пасля фактычнага аб'яднання гэтых гандлёвых аб'ектаў «Дабраном» стаў № 2 сярод прыватных рознічных аператараў Беларусі па колькасці магазінаў.

«БЯРОЗКА» АДПАЧЫВАЕ... ПРЫНАМСІ НА 10 ДЗЁН

Міністэрства гандлю краіны прыняло рашэнне прыпыніць працу сталічнай кавярні «Бярозка» з гэтага панядзелка.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення кантролю спажывецкага рынку — гандлёвай інспекцыі Мінгандлю Валяр'яна Бяспалага, «парушэнні традыцыйныя для грамадскага харчавання. Гэта — пратэрмінаваныя прадукты, невыкананне асартыментнага пераліку і іншыя». Спецыяліст адзначыў, што цяпер максімальны тэрмін прыпынення працы кавярні «Бярозка» складае 10 дзён, але калі прадпрыемства выправіць парушэнні раней, то Мінгандлю будзе гатовы аднавіць працу ўстановы.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 413/С-18998 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 44,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б/1; - капитальное строение, инв. № 413/С-18997 (назначение – здание неустановленного назначения (бойня), наименование – бойня), площадью 318,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б. Составные части и принадлежности: холодная пристройка, 2 склада.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425250100001001868, площадью 0,2444 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения), расположенный по адресу: г. Свислочь, ул. Свердлова, 3Б. Земельный участок имеет ограничения (обременение) прав в использовании: земли, расположенные в охранных зонах линий электропередачи (код 13.2), площадью 0,0139 га.
Начальная цена продажи	508 000 000 (пятьсот восемь миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	50 800 000 (пятьдесят миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей
Продавец	Свислочский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231969, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 3-50-22
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 05 августа 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

